Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

1 СНЕЖНЯ 2016 г. ЧАЦВЕР № 232 (28342)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Жанчын — у шахцёры?**

СТАР. 4

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА



**Убачыць «карціну» злачынства**



**У рытме хіп-хопа**

*ЛІЧБА ДНЯ*

**54 210 чалавек**

*працаўладкаваны ў краіне ў студзені–верасні гэтага года на нядаўна створаныя працоўныя месцы за кошт узнікнення новых прадпрыемстваў і вытворчасцяў. У эканоміцы краіны ў верасні 2016 года было занята 4 386,5 тыс. чалавек — на 2,3% менш, чым у верасні 2015 года. У агульнай колькасці занятага насельніцтва ў верасні 3 024,8 тыс. чалавек, або 69%, складалі работнікі арганізацый (без мікраарганізацый і малых арганізацый без ведамаснай падпарадкаванасці). Арганізацыямі (без мікраарганізацый і малых арганізацый без ведамаснай падпарадкаванасці) у верасні прынята на работу 63,9 тыс. чалавек, звольнена па розных прычынах 63,7 тыс. чалавек.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 01.12.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9795 | ▲ |
| Еўра | 2,1033 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0303 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0774 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# ЗІМОВЫ «ЦЯГНІК»



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Снежная прагулка мінчанкі Марыны ЛЮНДЫШАВАЙ: у калясцы — дачушка Люба, на санках — сын Багдан.

■ Абітурыент-2017

## З МЕДАЛЁМ... У ПРОФІЛЬ

Ці атрымаюць выпускнікі педагагічных класаў абяцаную льготу?

**Рэктар Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта Аляксандр ЖУК канстатуе: тон СМІ ў адносінах да прадстаўнікоў педагагічнай прафесіі апошнім часам прыкметна змяніўся.**




— І ў грамадстве сталі часцей казаць пра высокую місію педагога, пра перавагі настаўніцкай прафесіі: яе стабільнасць і сацыяльную абароненасць, працяглы летні адпачынак, — падкрэслівае ён. — Футуролагі сцвярджаюць, што ў сярэдзіне гэтага стагоддзя ў тройку самых запатрабаваных прафесій увойдуць тры: спецыяліст у сферы ІТ, урач і педагог. Таму застацца без работы шанцы ў настаўнікаў — мінімальныя...

СТАР. 4

■ Працяг тэмы

## ЦІ БУДЗЕ СУХІ ФІНАЛ У МОКРАЙ ГІСТОРЫІ?..

**Пакуль рамонтнікі і жыхары высвятляюць, якой таўшчыні павінен быць уцяпляльнік, у кватэрах пайшла цвіль**

**Змена заканадаўчых дакументаў, няправільна выкананыя рашэнні і нават надвор'е зацягнулі капітальны рамонт у сталічным доме №22 па вуліцы Калініна больш як на год. Пра гэта расказвалася ў артыкуле «Такі капрамонт нам патрэбны?», які выйшаў у «Звяздзе» 28 кастрычніка. Мінуў месяц, але, як высветлілася, да гэтага часу фасад не ўцеплены, газавыя награвальныя калонкі не дэманціраваны, а праз замочаную знешнюю сцяну ў кватэрах з'явілася цвіль.**

### Старому дому — старыя паказчыкі

Карагод праблем пачаўся пасля рашэння адміністрацыі Першамайскага раёна сталіцы выключыць работы па ўцяпленні фасадаў з праекта капрамонту. Яно было прынятае на падставе ўрадавай пастановы, якая выйшла ў красавіку 2016-га і датычыцца планавання, правядзення і фінансавання капітальных рамонтаў будынкаў. Жыхароў абурыла, што замест першапачаткова запланаванага ўцяплення мінералватнымі плітамі таўшчынёй 110 мм фасад вырашылі закрыць 30-міліметровым слоем пенапласту.

Адстойваючы свае правы, уласнікі пачалі пісаць звароты ў розныя дзяржаўныя ўстановы, у рэдакцыю. Як вынік — у газеце з'явілася згаданая публікацыя. Адказ на яе прыйшоў ад **КУП «Жыллёвая камунальная гаспадарка Першамайскага раёна г. Мінска».** У ім дырэкцыя прадпрыемства тлумачыць прынятыя ў дачыненні да праектна-каштарыснай дакументацыі (далей — ПКД) змены, спасылаючыся на загад Міністэрства ЖКГ аб правядзенні капрамонту ў 2015 годзе, дзе сказана, што «цеплатэхнічныя характарыстыкі знешніх агараджальных канструкцый павінны быць даведзены да нарматыўных патрабаванняў на момант праектавання жылога будынка пры яго будаўніцтве». Гэта значыць, што старому дому па вуліцы Калініна не трэба адпавядаць сучасным нарматывам па цяплу — яму дастаткова дасягнуць тых, што дзейнічалі ў краіне на момант яго будаўніцтва некалькі дзесяцігоддзяў таму.

СТАР. 3

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

■ Парламенцкі дзённік

## Заканадаўцы могуць садзейнічаць інтэграцыі,

### лічыць спікер верхняй палаты беларускага парламента

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ падчас чарговага пасяджэння першай сесіі шостага склікання заклікаў парламентарыяў уносіць прапановы па паляпшэнні заканадаўства, зыходзячы з праблем, якія блізкія людзям.**

Асобна парламентарый звярнуў увагу на гарманізацыю і ўніфікацыю заканадаўства членаў Еўразійскага эканамічнага саюза і Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. На яго думку, дапамагчы вырашыць праблему разрэгуляванасці ўнутранага рынку саюза могуць менавіта парламентарыі.

Акрамя таго, падчас сесіі былі ратыфікаваны шэраг разнапланавых пагадненняў з іншымі краінамі. Па словах **Сяргея РАХМАНАВА, старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы,** гэтыя законапраекты ахопліваюць два блокі: «Першы тычыцца спрашчэння візавага рэжыму ў абменах Беларусі з Гватэмалай і Босніяй і Герцагавінай. Гэта важныя дакументы, якія дазволяць нам прасоўваць, у першую чаргу, свае эканамічныя інтарэсы, інтэнсіфікаваць дзелавыя абмены і кантакты ў краінах Лацінскай Амерыкі і Цэнтральнай Еўропы. Другі блок пагадненняў звязаны з энергетыкай. Адно з іх — паміж Беларуссю і Арменіяй — і тычыцца атамнай энергетыкі».

Усяго ў Савеце Рэспублікі ў сераду было разгледжана 13 пытанняў. Сярод іншага, сенатары далі згоду на абранне чатырох суддзяў Вярхоўнага суда і аднаго — Віктара Рабцава — у Канстытуцыйны суд.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

## Віцэ-спікер Палаты прадстаўнікоў едзе ў Панаму

**Беларускі парламентарый упершыню прыме ўдзел у мерапрыемствах Лацінаамерыканскага парламента. Намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Баляслаў ПІРШТУК стане ўдзельнікам XXXII Генеральнай асамблеі Лацінаамерыканскага парламента, якая будзе праходзіць з 1 па 3 снежня ў Панаме.**

Падчас гэтага мерапрыемства віцэ-спікер ніжняй палаты выступіць з прывітальным словам, а таксама правядзе рабочыя сустрэчы з членамі афіцыйных дэлегацый парламентаў — членаў Лацінаамерыканскага парламента, прадстаўнікамі іншых міжпарламенцкіх арганізацый. Як паведамляе прэс-служба Палаты прадстаўнікоў, прадметам для абмеркавання стануць пытанні двухбаковага міжпарламенцкага супрацоўніцтва.

Нагадаем, у сакавіку 2016 года было падпісана Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь і Лацінаамерыканскім парламентам, у адпаведнасці з якім беларускаму парламенту быў нададзены статус пастаяннага назіральніка пры розных органах Лацінаамерыканскага парламента.

**Раман АЛЯХНОВІЧ.**

## ТРЭБА ВУЧЫЦЦА КАНКУРЫРАВАЦЬ — ВА ЎСІХ СФЕРАХ

### Віцэ-прэм'ер і міністры адказалі на пытанні парламентарыяў

**Учора дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі новага склікання ўпершыню правялі сумеснае пасяджэнне і задалі свае пытанні прадстаўнікам урада. З дакладам перад парламентарыямі выступіў намеснік прэм'ер-міністра Анатоль КАЛІНІН, які расказаў пра перспектывы развіцця сфер транспарту, сувязі, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, будаўніцтва.**

### Транспарт прыцягвае валюту

— Мы павінны быць падрыхтаванымі да работы ва ўмовах складанай знешняй кан'юнктуры, — заявіў Анатоль Калінін. — Гэта значыць, больш эфектыўна канкурыраваць на знешніх рынках. У такіх умовах многае залежыць ад работы інфраструктурных галін. Асабліва месца тут займае транспартная сфера, паколькі геапалітычнае становішча Беларусі робіць нас важным камунікацыйным цэнтрам. Мы збіраемся і надалей развіваць гэту перавагу.

Па словах віцэ-прэм'ера, унёсак транспартнага комплексу ў валавы ўнутраны прадукт складае прыкладна 6 працэнтаў. Ён жа з'яўляецца адной з асноўных крыніц паступлення валюты.

**Член Савета Рэспублікі ад Мінскай вобласці Сяргей ГАЙДУКЕВІЧ** задаў пытанне пра экспарт паслуг. Анатоль Калінін расказаў, што ў гэтым кірунку айчынныя арганізацыі працуюць у Расіі, Польшчы, Украіне, Венесуэле, Эквадоры...

— Асноўны рынак для нас — Расійская Федэрацыя. Толькі ў гэтай краіне па дарожным будаўніцтве ў наступным годзе мы плануем прыбавіць аб'ём экспартных паслуг прыкладна на 100 мільёнаў долараў.

### Жыллё з дзяржпадтрымкай патаннее

Віцэ-прэм'ер таксама паведаміў, што жыллё з дзяржпадтрымкай можа будавацца па цане не больш за 280 долараў за квадратны метр. Анатоль Калінін бачыць рэзервы для таго, каб знізіць выдаткі на будаўніцтва жылля з дзяржпадтрымкай і прапанаваць больш камфортныя ўмовы па кошце квадратнага метра. На гэты момант кошт аднаго квадратнага метра жылля з дзяржпадтрымкай складае каля 340 долараў.

**Дэпутат ад Васняцоўскай выбарчай акругі №93 (г. Мінск) Валерый БАРАДЗЕНЯ** звярнуў увагу на тое, што ў сталіцы даўно не рухаецца чарга на паляпшэнне жыллёвых умоў для сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў. Віцэ-прэм'ер паведаміў, што сёлета ўрад удзяліў асноўную ўвагу шматдзетным сем'ям.

— Прычына — у абмежаванасці нашых магчымасцяў. Дастаткова складана вядзецца дыялог па праграме «Жыллё-2017», запрашаю дэпутацкі корпус далучыцца да абмеркавання. Але ні ў якім разе не здымаецца з парадку дня забяспечанасць жыллём сірот і прыроўненых да іх катэгорый грамадзян, — сказаў ён.

### Не рэформа, а пераўтварэнні

**Алег ЛЕЎШУНОЎ, дэпутат ад Гомельскай-Цэнтральнай выбарчай акругі №33,** пацікавіўся, наколькі паспяхова праходзіць рэформа ў сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

— Казаць, што ідзе рэформа — няправільна, — звярнуў увагу Анатоль Калінін. — Праходзіць поўнае пераўтварэнне ў рамках выпрацаваных рашэнняў. На жаль, пакуль зроблена не ўсё. Мы маглі б зрабіць нашмат больш, калі б мелі дадатковы інвестыцыйны рэсурс. Пераўтварэнні ў сферы ЖКГ мы праводзім з улікам фінансавых магчымасцяў. Самае галоўнае — я сам бачу, што ЖКГ-паслугі ў нашай краіне аказваюцца ўсюды на неабходным узроўні.

**Дэпутат ад Брэсцкай-Заходняй выбарчай акругі №1 Леанід БРЫЧ** спытаў пра тое, што можна зрабіць, каб паскорыць працэс разліку гандлёвых сетак з вытворцамі. Па яго словах, для прадпрыемстваў гэта — вельмі балючая тэма.

— Трэба, каб Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю літаральна зараз зрабіла нейкія тэрміновыя крокі, а не спасылалася на тое, што яно плануе ўнесці пэўныя змены і дапаўненні ў Закон «Аб дзяржаўным рэгуляванні гандлю і грамадскага харчавання». Натуральна, што змены ў закон патрэбныя, але гэта зойме час. На сёння гандлёвыя прадпрыемствы маюць вельмі вялікую дэбіторскую запазычанасць, у тым ліку пратэрмінаваную, за пастаўлены айчыннымі вытворцамі тавар. Гэта, відаць, тычыцца буйных гандлёвых сетак, якія сёння займаюць дамінуючае становішча на рынку нашай дзяржавы. Трэба, каб урад, Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю зрабілі больш сур'ёзныя намаганні, каб вырашыць гэту праблему.

**Уладзімір КАЛТОВІЧ, міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю,** звярнуў увагу на тое, што дзяржава не заўсёды павінна ўмешвацца ва ўзаемаадносіны паміж вытворцамі тавараў і гандлёвымі сеткамі. На яго думку, падобныя пытанні арганізацыі павінны вучыцца вырашаць самастойна.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■ Ва ўрадзе

## МАТРЫЦА ДЛЯ ВЕРТЫКАЛІ ЎЛАДЫ

### Савет Міністраў вызначыў механізм прыросту эканомікі

**Павышэнне прадукцыйнасці працы на дзеючых прадпрыемствах, удасканаленне сістэмы кіравання, актыўная работа на знешніх рынках, развіццё малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, прыцягненне інвестыцый — такімі шляхамі плануецца паляпшаць эканамічны стан у краіне ў наступным годзе. Пра гэта заявіў падчас чарговага пасяджэння Прэзідыума Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ.**

Падчас нарады гутарка ішла аб праекце пастановы Саўміна «Аб рэалізацыі задач сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2017 год». У кастрычніку бягучага года Прэзідэнт падпісаў адпаведны Указ пра задачы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2017-ы. У гэтым дакуменце вызначаны важнейшыя параметры прагнозу, іх колькасныя арыенціры і сфармуляваны асноўныя задачы на бліжэйшы год.

«Кіраўнікам дзяржавы даручана выбудаваць поўную матрыцу персаніфікаваных пакватальных задач на 2017 год, мабілізаваць усю вертыкаль улады на дасягненне канкрэтных вынікаў. Ад урада і аблвыканкамаў патрабуецца арганізаваць працу кіраўнікоў усіх узроўняў, нацэліўшы іх на павышэнне эфектыўнасці вытворчасці тавараў і паслуг, зніжэнне выдаткаў, нарошчванне і дыверсіфікацыю экспарту, стварэнне новых працоўных месцаў, прыцягненне прамых замежных інвестыцый, а таксама вырашэнне іншых прыярытэтаў сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны», — адзначыў прэм'ер-міністр.

Андрэй Кабякоў заявіў, што пры фарміраванні прагнозу на 2017 год вызначана структура прыросту ВУП. Па яго словах, палова — за кошт росту прадукцыйнасці працы на дзеючых прадпрыемствах, істотнага скарачэння выдаткаў, укаранення новых тэхналогій і ўдасканалення сістэмы кіравання, больш актыўнай і агрэсіўнай працы на знешніх рынках. Другую палову прыросту плануецца атрымаць за кошт «новай эканомікі». «Фактычна гэтая задача вырашаецца праз развіццё малога і сярэдняга бізнесу, стварэнне новых прадпрыемстваў, новых працоўных месцаў, прыцягненне замежных інвестыцый. На гэтым грунтуюцца і мэтавыя задачы ў прадстаўленым праекце пастановы», — падкрэсліў прэм'ер.

Затым Андрэй Кабякоў дадаў, што аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму неабходна ў сціснутыя тэрміны прыняць усе неабходныя рашэнні па давядзенні ключавых паказчыкаў эфектыўнасці старшыням гар- і райвыканкамаў, а таксама кіраўнікам адміністрацый у Мінску «для фарміравання поўнай і правільна структураванай матрыцы задач усёй вертыкалі ўлады».

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Меркаванне



## У ЧЫМ ІНТРЫГА ПЕРАМОЎ ПА УКРАІНЕ

**29 лістапада ў Мінску зноў адбыліся перамовы ў нармандскім фармаце на высокім узроўні. Ужо зыходзячы з таго, што яны праводзіліся не на вышэйшым узроўні (у перамовах прымалі ўдзел міністры замежных спраў, а не прэзідэнты і прэм'ер-міністры), асаблівых чаканняў па прарыўных рашэннях не было. Калі б быў хоць бы намёк на такую магчымасць, перамовы праходзілі б на вышэйшым узроўні, каб поспех прынёс дадатковыя бонусы самым важным удзельнікам у іх пазіцыянаванні як паспяховых лідараў на ўнутрыпалітычным і знешнепалітычным напрамках. Адзіная інтрыга была ў тым, што гэта першыя перамовы па Украіне на такім высокім узроўні пасля таго, як свет даведаўся пра вынікі амерыканскіх прэзідэнцкіх выбараў.**

Зусім не сакрэт, што непадатлівасць украінскіх перамоўшчыкаў тлумачыцца досыць проста — яны працуюць у цесным кантакце з Вашынгтонам, а ЗША пры прэзідэнцтве Барака Абамы цвёрда агучылі пазіцыю — ніякіх саступак Расіі, толькі магутны націск на Маскву. Адсюль ключ да разумення інакш неспасцігальнай сітуацыі — у лютым 2015 года ў Мінску было дасягнута пагадненне аб тым, як Украіне вярнуць назад свае тэрыторыі, якія зараз утрымліваюцца ДНР і ЛНР, а Кіеў да гэтага часу так і не зрабіў ні аднаго кроку са свайго боку ў гэтым кірунку. Хуткі прыход да ўлады ў ЗША Трампа, які выразна агучыў гатоўнасць менш увагі ўдзяляць свету і больш Амерыцы, пахіснулі пазіцыі Кіева на перамовах. Украінскім элітам незразумела, наколькі саслабне падтрымка амерыканцамі Кіева, і ці будзе яна наогул, ці рэалізуе Трамп свае намеры палепшыць адносіны з Расіяй, што можа адбіцца ў шкоду адносінам з Украінай. Зрэшты, гэта тая інтрыга, якая не вырашыцца раней першых крокаў Трампа ў якасці прэзідэнта ЗША, а гэтага яшчэ чакаць сем тыдняў.

У выніку амерыканскіх выбараў на перамовах 29 лістапада пазіцыі ўкраінскай дэлегацыі пахіснуліся, а расійскай — умацаваліся. Але гэта не спрыяла сапраўды сур'ёзным зменам. Можна прааналізаваць вынікі перамоў з пункту гледжання замежнай прэсы.

Расійская дзелавая газета «Взгляд» адзначае, што, па словах міністра замежных спраў Сяргея Лаўрова, на сустрэчы ў Мінску не было дасягнута ніякіх прарываў. Таксама журналісты выдання робяць акцэнт на заяве міністра замежных спраў Германіі Франка-Вальтэра Штайнмаера, па словах якога, да дасягнення палітычнага рашэння па Украіне яшчэ вельмі далёка.

З пункту гледжання аглядальнікаў ВВС, не ўсё так дрэнна. Яны каментуюць заяву кіраўніка МЗС Германіі Штайнмаера, што на перамовах удалося дабіцца прагрэсу па пытанні абмену палоннымі, яшчэ адным ключавым пункце мінскіх пагадненняў. Існуе магчымасць, што бакі дамовяцца аб усеагульным абмене да канца года пры дапамозе Міжнароднага Чырвонага Крыжа. Акрамя таго, міністр замежных спраў Германіі паведаміў, што бакі на сустрэчы дамовіліся аб адводзе тэхнікі яшчэ з чатырох кропак на лініі судакранання. Ёсць пэўны аптымізм і ў міністра замежных спраў Францыі. Па словах Жан-Марка Эйра, нават калі весці дыялог вельмі цяжка, усё ж механізм перамоў не зламаны і мінскія пагадненні 2015 года трэба выконваць.

Журналісты New York Times зрабілі галоўны акцэнт на негатыўных момантах сустрэчы. У артыкуле па выніках перамоў была прыведзена цытата з выступлення міністра замежных спраў Украіны Паўла Клімкіна пра тое, што Расія не пагадзілася ні з адным з ключавых прыярытэтаў падчас перамоў. Паміж Расіяй і Украінай захоўваецца фундаментальныя адрозненні наконт таго, якім чынам рэалізоўваць дарожную карту па мірным урэгуляванні.

На думку аглядальнікаў Washington Post, перамовы ў Мінску не прынеслі пазітыву. Яны адзначылі, што міністр замежных спраў Расіі абвінавацілі украінскі бок у адсутнасці прагрэсу па палітычных рэформах, прадугледжаных у пагадненнях лютага 2015 года. Украінскі бок, у сваю чаргу, адказаў абвінавачваннямі ў тым, што расійская армія ўсё яшчэ не выведзена з усходу Украіны.

Deutsche Welle апублікавала вялікае інтэрв'ю з экспертам Штэфанам Майстэрам. На яго думку, прагрэсу на перамовах няма, таму што расійскі бок чакае ўступлення новага амерыканскага прэзідэнта на пасаду, разлічваючы на адмен санкцый і паляпшэнне перамоўнай пазіцыі.

Украінскае выданне Весці-UA працытавала выключна пазіцыю міністра замежных спраў Украіны аб тым, што няма згоды па ўсіх прынцыповых пытаннях.

Тэлеканал 112 Украіна транслявау вынікова інтэрв'ю міністра замежных спраў Украіны, на думку якога Расія «хоча фактычна легітымізаваць свой пратэктарат або калонію на Данбасе, не здзяйсняючы крокаў па перадачы кантролю над тэрыторыяй акупаванага Данбаса міжнароднай супольнасці, АБСЕ, не здзяйсняючы крокаў па паляпшэнні бяспекі, не ажыццяўляючы гуманітарныя крокі».

**Сяргей КІЗІМА,**
**доктар палітычных навук**

■ Датычыцца кожнага

# БЕЗ ЭМОЦЫЙ І АСУДЖЭННЯ

## Што трэба, каб хворы на СНІД стаў на ўлік і пачаў лячэнне

**Што ставяць сабе за мэту грамадскія арганізацыі, якія актыўна прыцягваюць у прафілактыку ВІЧ/СНІДу фінансавыя сродкі замежных фондаў і арганізацый? Спыніць распаўсюджванне інфекцыі, вядома! Але якім чынам? Што такога робяць адзінкі, пакуль большасць працягвае... спакойна спаць?**



У Расіі абмежавалі грамадскую ініцыятыву па прафілактыцы ВІЧ. У выніку там пачаўся рост распаўсюджвання інфекцыі, аб чым зараз актыўна пішуць СМІ суседняй краіны. Беларусі ўдаецца захоўваць стабільную сітуацыю дзякуючы велізарным намаганням у тым ліку недзяржаўных грамадскіх арганізацый. Яны ахапілі сёння прафілактычнымі паслугамі больш за 5 тысяч жанчын — прадстаўніц секс-бізнесу, каля 6 тысяч мужчын, якія мелі секс з мужчынамі, і звыш 40 тысяч спажыўцоў ін'екцыйных наркотыкаў. Аднак літаральна праз пару гадоў сітуацыя можа змяніцца да горшага...

Перамагчы эпідэмію сёння — гэта значыць дабіцца «трох 90». Каб 90 працэнтаў людзей з ВІЧ ведалі пра свой статус (у нас сёння, паводле ацэнкі, «у курсе» толькі 48 працэнтаў), каб 90 працэнтаў з гэтых 90 атрымлівалі лячэнне — антырэтравірусную тэрапію (у нас такіх толькі 48 працэнтаў), і каб яшчэ 90 працэнтаў з ліку апошніх лячыліся штодня і ўсё жыццё (толькі ў такім разе яны перастаюць быць крыніцай інфекцыі для іншых). Грамадскія арганізацыі дабіваюцца таго, каб чалавек не баяўся даведацца пра стан свайго здароўя, меў магчымасць пагаварыць з тымі, хто «ў тэме», і атрымліваў лячэнне.

Эпідсітуацыя паказвае, што не толькі групы рызыкі — спажыўцы ін'екцыйных наркотыкаў, мужчыны, якія маюць секс з мужчынамі, і жанчыны секс-бізнесу, — але і ў цэлым насельніцтва падвяргаюцца небяспецы заражэння ВІЧ-інфекцыяй. 60 працэнтаў інфіцыраваных заражаюцца палавым шляхам. Прычым у нас даўно няма ніводнай адміністрацыйнай тэрыторыі, дзе не было б выяўлена хоць бы аднаго выпадку. А ў Гродзенскай вобласці ёсць нават 85-гадовы мужчына, якому ўнук зрабіў недзяржаўны наркатычны «падарунак». Карацей, рызыкуюць усе.

У 2004 годзе наркотыкі і палавы шлях забяспечылі ў справе перадачы ВІЧ прапорцыю 50/50. З таго моманту ў групе рызыкі апынуліся ўсе, хто займаецца сексам. «Аднак рухаючым механізмам інфекцыі застаюцца наркаспажыўцы, сярод якіх фактычна кожны чацвёрты жыве з ВІЧ, — кажа **старшыня Беларускага грамадскага аб'яднання «Пазітыўны рух» Ірына СТАТКЕВІЧ**. — Мы займаемся праграмамі зніжэння шкоды, якія падтрымліваюць міжнародныя арганізацыі, у тым ліку Глабальны фонд па барацьбе з ВІЧ, туберкулёзам і малярыяй. Так з'явіліся пункты абмену шпрыцаў, з дапамогай якіх удалося ахапіць у Мінску спачатку 5 тысяч (пры тым, што па самых прыблізных падліках, у горадзе пражывае каля 30 тысяч наркаспажыўцоў), праз год з намі былі ўжо каля 12 тысяч, сёння — 17 тысяч (па краіне — 40 тысяч)... Гэтыя людзі не думаюць пра нейкія захворванні, яны не баяцца ВІЧ ці гепатыту С, а мы спрабуем данесці да іх інфармацыю пра гэту рызыку, звязаць з урачом-інфекцыяністам».

Да вырашэння праблемы распаўсюджвання ВІЧ грамадскія арганізацыі падключыліся ў канцы 1990-х, калі разам з дзяржаўнымі ўстановамі пачалі нялёгкую работу з вышэйпералічанымі ўразлівымі групамі. І гэта была не толькі раздача бясплатных прэзерватываў, абмен шпрыцаў, але і прадастаўленне кансультацыі, накіраванне на тэсты... «Залежныя ад наркотыкаў або тыя, хто займаецца камерцыйным сексам, могуць звяртацца да нас, бо мы створаны менавіта для дапамогі канкрэтным людзям, — тлумачыць **старшыня Беларускай асацыяцыі клубаў ЮНЕСКА Дзмітрый СУБЦЭЛЬНЫ**. — Мы распрацоўваем у тым ліку метады бясплатнага дыстанцыйнага навучання, і гэтым могуць карыстацца медыкі, педагогі, валанцёры, якія працуюць з яшчэ адной вельмі важнай групай рызыкі — моладдзю. Важна выяўляць найбольш рызыкоўных маладых людзей, каб яны своечасова атрымлівалі неабходную кансультацыю».

З мінулага года ў краіне асобная ўвага звернута на мужчын, якія маюць секс з мужчынамі. Размова — не пра сексуальную арыентацыю, а пра сексуальныя паводзіны: паводле неафіцыйных даследаванняў, 10 працэнтаў мужчын, якія маюць секс з мужчынамі, жанатыя, каля 2 працэнтаў жывуць незарэгістраваным шлюбам з жанчынамі, 45 працэнтаў мужчын гэтай катэгорыі ўступалі калі-небудзь у сексуальныя кантакты з жанчынамі. Так што гэта група рызыкі — прамы мост для перадачы ВІЧ у агульную папуляцыю. «Але, на маю думку, дзяржава не гатова падтрымаць прафілактыку такой катэгорыі замест Глабальнага фонду», — лічыць **старшыня праўлення Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Сустрэча» Аляксандр ШАБЛЫКА.**

На базе недзяржаўных грамадскіх арганізацый сёння працуе 48 ананімных кансультацыйных пунктаў, дзе спецыялісты размаўляюць на роўных, без эмоцый і асуджэння, пасля чаго з'яўляецца рэальны шанц, што нематываваны да гэтага прадстаўнік групы рызыкі з'явіцца ў дзяржаўнай установе, стане на ўлік і пачне лячэнне.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

*protas@zviazda.by* ■

# ЦІ БУДЗЕ СУХІ ФІНАЛ У МОКРАЙ ГІСТОРЫІ?..

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Кіраўніцтва Першамайскай ЖКГ сцвярджае, што пенапласт таўшчынёй 30 мм «...забяспечвае адпаведнасць цеплавой аховы і супраціву цеплаперадачы знешніх агараджальных канструкцый дома №22 патрабаванням ТКП 45-1.04-206-2010 «Рамонт, рэканструкцыя і рэстаўрацыя жылых і грамадскіх будынкаў і збудаванняў...». Аднак жыхары ў гэтым сумняваюцца і хочуць, каб слой уцяпляльніка быў таўсцейшы.

### Чаго чакае фасад?

**Аляксандр МАЦЭВІЧ, дырэктар КУП «Жыллёвая камунальная гаспадарка Першамайскага раёна г. Мінска»** тлумачыць у лісце перапыненне работ па ўцяпленні наступным:

— З прычыны выканання жадання ўласнікаў (наймальнікаў) жылога дома №22 павялічыць таўшчыню пліт уцяплення за кошт уласных сродкаў, работы па рамонце фасадаў на гэтым аб'екце прыпыненыя да афармлення неабходнай дакументацыі згодна з заканадаўствам.

Трэба заўважыць, што капітальны рамонт адбываецца адразу ў трох дамах па вуліцы Калініна: №№ 18, 20 і 22. Слой уцяпляльніка па фасадзе быў паменшаны ва ўсіх іх. У лісце з Дзяржкамітэта па стандартызацыі, які прыйшоў у адказ на зварот жыхароў дома №22, паведамляецца, што новую праектную дакументацыю (пра выкарыстанне іншага ўцяпляльніка) Першамайская ЖКГ на дзяржэкспертызу ў кастрычніку не прадстаўляла.

У сваю чаргу **галоўны інжынер ЖКГ Першамайскага раёна Сяргей ЖАХОЎСКІ** упэўнівае, што «калі змены ў ПКД не прыводзяць да павелічэння кошту капрамонту, іх не абавязкова накіроўваць на экспертызу».

— Пэўныя змены ў праектах уцяплення дамоў адбываюцца амаль паўсюдна, гэта непазбежна на кожным канкрэтным будынку. А праз сітуацыю з домам №22 па вуліцы Калініна склалася беспрэцэдэнтнае становішча — цяпер па ўсім Мінску заказчыкі капітальнага рамонту павінны дасылаць змененыя рашэнні на экспертызу. А гэта дадатковыя тэрміны і грошы, якія лягуць на плечы ўсіх мінчан, нават тых, хто ніколі толькі робіць адлічэнні на рамонт, і дзе ён яшчэ не запланаваны, — дадаў ён.

У лісце Дзяржстандарта, між іншым, паведамляецца: інспекцыйныя праверкі дамоў №20 і №22 па вуліцы Калініна ў кастрычніку бягучага года ўстанавілі, што шэраг работ на доме №22 выконваўся з парушэннем патрабаванняў тэхнічных нарматыўных прававых актаў. Інспекцыя выявіла парушэнні зацверджанай ПКД і пры ўцяпленні пенапластам у 30 мм фасада дома №20. У выніку работы па ўцяпленні фасада прыпыненыя, «падрыхтаваны матэрыялы па прыцягненні да адміністрацыйнай адказнасці заказчыка, падрадчыка, аўтарскага і тэхнічнага нагляду, а таксама накіравана прадпісанне па ліквідацыі выяўленых парушэнняў».

### Вада знадворку і ўнутры

Вялікую і мокрую праблему стварыла жыхарам дома №22, як пісала «Звязда», зняцце вадасцёкавых труб пры рамонце страхі. Праз дзіркі ў жолабе, які прахадзіць пад дахам, дажджавая вада лілася на будаўнічыя рыштаванні і сцены. У выніку ў кватэры №35 першага паверха канструкцыя прамокла наскрозь. У кастрычніку ў пацярпелым памяшканні было два камісійныя абследаванні, па выніках якіх «па заканчэнні рамонтных работ генпадрадный арганізацыяй будуць праведзены адпаведна-аздобныя работы ў гэтай кватэры», — паабяцалі ў лісце з ЖКГ.

Іншыя ўласнікі адчуваць наступствы мокрых сцен сталі крыху пазней. Так, над вокнамі кватэры №29 маюцца пастаянныя сляды заліцця, а ў кватэры №48 увогуле па ўнутранай частцы залітай сцяны па шпалерах пайшла цвіль. Яе жыхарка Ганна Манцікая накіравала ў дырэкцыю ЖКГ ліст з просьбай прасушыць сцяну знутры кватэры і вывесці цвіль. Камунальнікі Першамайскага раёна наведаліся ў азначаную кватэру і, па словах гаспадароў, не склалі ніякага акта, паабяцаўшы прыйсці праз 20 дзён.

Дарэчы, газавыя калонкі, якія прадстаўнікі жыллёвай гаспадаркі планавалі дэманціраваць яшчэ пару тыдняў таму, працуюць у кватэрах дагэтуль, і сістэма цэнтралізаванага падагрэву вады так і не наладжана. Пры гэтым жыхары некалькіх кватэр паспяшаліся пазбавіцца ад калонак загадзя, выкліказўшы для гэтага адпаведныя службы. Цяпер тыя, хто паспадзяваўся на хуткае рашэнне пытання, засталіся ўвогуле без гарачай вады.

Улічваючы колькасць існуючых і новых праблем, нават намёку на канец гэтых рамонтных работ пакуль што не відаць. А на дварэ ўжо зіма...

**Ірына СІДАРОК.**

*sidarok@zviazda.by*

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## Павышаюцца пенсіі

**Працоўныя пенсіі, па ацэнцы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, павялічацца з 1 снежня ў сярэднім на 5 працэнтаў. Прафінансуе іх чарговае павышэнне дзяржаўны пазабюджэтны фонд сацыяльнай абароны насельніцтва.**

Сярэдняя пенсія, пачынаючы з гэтага месяца, будзе раўняцца прыблізна 298,19 рубля. Як адзначаюць спецыялісты, памер павышэння пенсіі ў кожнага пенсіянера будзе залежаць ад індывідуальных параметраў стажа работы і велічыні заробку да звароту па пенсію.

**Святлана БУСЬКО.**

## Каб пачуць і дапамагчы

Ва ўсіх рэгіёнах краіны працягваюць работу прамыя тэлефонныя лініі. Разбірацца ў камунальных, жыллёвых, дарожных і іншых набалелых пытаннях 3 снежня будуць прадстаўнікі абласных, гарадскіх і раённых выканаўчых камітэтаў, а таксама кіраўнікі справамі. Патэлефанаваць чыноўнікам можна з 9 раніцы да 12 гадзін. Нагадаем, «гарачыя» лініі працуюць кожную суботу.

**Брэсцкі аблвыканкам:**
старшыня Савета дэпутатаў Ашмянцаў Сяргей Дзмітрыевіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам:**
першы намеснік старшыні Грабнёў Генадзь Іванавіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам:**
старшыня Савета дэпутатаў Барысенка Алег Леанідавіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам:**
намеснік старшыні Дзяшко Уладзімір Іосіфавіч (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам:**
старшыня Савета дэпутатаў Ісачэнка Анатоль Міхайлавіч (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам:**
намеснік старшыні Сірэнка Віктар Іванавіч (80175004160);

**Мінскі гарвыканкам:**
намеснік старшыні Карпенка Ігар Васільевіч (80172224444).

## Сітуацыя пад кантролем

**Як ужо паведамлялася, у нядзелю вечарам на Прыбугскім падземным сховішчы газу адбылася аварыя. У панядзелак вечарам уцечку газу спынілі, свідравіну загерметызавалі.**

Але ў ноч на 30 лістапада адбыўся паўторны прарыў газу. Як паведаміў памочнік начальніка Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС Сяргей МАШНОЎ, у сціслыя тэрміны ўдалося ліквідаваць уцечку. У свідравіну запампоўваецца спецыяльны раствор. Рамонтныя работы будуць завершаны найбліжэйшымі днямі.

Паводле слоў Сяргея Машнова, санітарныя службы пастаянна вядуць маніторынг загазаванасці паветра. Рэгіструюцца паказчыкі блізкія да нормы. На выпадак перавышэння дапушчальнай канцэнтрацыі быў распрацаваны план эвакуацыі жыхароў найбліжэйшых населеных пунктаў. На шчасце, экстранных мер прымаць не давялося, сітуацыя заставалася пад кантролем.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

## Рыхтуемся да навагодніх кірмашоў

**Каля 15 тысяч калядных і навагодніх выставак-продажаў і кірмашоў плануецца правесці ў Беларусі. Такая інфармацыя прагучала на калегіі Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю.**

Як паведаміла яго прэс-служба, у перыяд калядных і навагодніх свят па краіне запланавана правядзенне каля 890 святочных кірмашоў, а таксама каля 14 тысяч 965 мерапрыемстваў, скіраваных на стымуляванне пакупніцкага попыту, — выставак-продажаў, акцый па зніжэнні цаны тавараў і іншых рэкламных мерапрыемстваў.

## Кошт заказу — на выбар кліента

**Напярэдадні зімовых свят пра гэта нагадаюць кавярням і рэстаранам**

З гэтай мэтай Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю правядзе маніторынг аб'ектаў грамадскага харчавання.

Гандлёвая інспекцыя актывізуе назіранне з мэтай кантролю выканання заканадаўства аб'ектамі грамадскага харчавання ўсіх форм уласнасці. Асаблівая ўвага, як паведамляе прэс-служба міністэрства, будзе ўдзелена парадку афармлення папярэдніх заказаў на абслугоўванне, недапушчальнасці вызначэння мінімальнага кошту заказу, а таксама ўстанаўлення платы за арэнду памяшкання, у якім праводзіцца абслугоўванне.

Пра факты парушэнняў у аб'ектах грамадскага харчавання грамадзяне могуць паведамляць па «тэлефоне даверу» гандлёвай інспекцыі Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю (8 017) 200-92-02.

## Выратавалі з пятлі лася

**У Крупскім раёне на граніцы з заказнікам «Сялява» аператыўнікі Дзяржінспекцыі знайшлі лася, які трапіў у бяду.**

Жывёла прыйшла паласавацца яблыкамі ў стары калгасны сад. Калі сахаты паспрабаваў падабраць плады з зямлі, то заблытаўся рагамі ў прывязанай да дрэва браканьерскай пятлі. Апошняя была скручана з трывалага стальнога троса так, што нават моцная жывёла не магла яго разарваць. Спрабуючы вырвацца, лось кідаўся і ўсё тужэй зацягваў пятлю на рагах. Каб вызваліць жывёлу, давялося трос перасекчы. Месца незаконнага палявання дзяржінспектары ўзялі на заметку. Цалкам магчыма, што неўзабаве будуць злоўлены браканьеры, якія займаліся тут паляваннем.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Спрэчны момант

# МОНАКАР'ЕРНАЯ СЯМ'Я — НЕ НАША РЭАЛЬНАСЦЬ?

## Чаму жанчын трэба пускаць у шахты, а мужчын пакідаць дома за няньку

**Жанчын з маленькімі дзецьмі наймальнікі лічаць галаўным болем і неахвотна бяруць на работу. Затое сямейных мужчын успрымаюць як надзейных і адказных работнікаў і нават гатовы ім павысіць заробак: бацьку ж трэба карміць сям'ю. Якія яшчэ стэрэатыпы замацаваліся на рынку працы? Ці часта мужчыны і жанчыны сутыкаюцца з дыскрымінацыяй па прыкмеце полу? Гэтыя і іншыя пытанні абмяркоўвалі спецыялісты падчас «круглага стала» ў прэс-цэнтры Sputnik Беларусь.**


Фота Надзеі БУЖАН.

### Схаваная дыскрымінацыя

У камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама кажуць, што гендарную дыскрымінацыю ў чыстым выглядзе яны рэдка назіраюць.

— Наймальнік не можа напісаць у аб'яве, што хоча бачыць у сябе на рабоце мужчыну 35 гадоў, паколькі гэта незаконна. Але ці часта вы сустракалі жанчын сярод кансультантаў у краме тэхнікі? Ці мужчын — майстраў па манікюры? Часта чалавек падае рэзюмэ, і быццам бы яго вопыту і кваліфікацыі хапае для гэтай вакансіі, але яму адмаўляюць з няясных прычын. Бо ў работадаўца ёсць пэўныя стэрэатыпы, — кажа **начальнік аддзела арганізацыі навучання грамадзян упраўлення занятасці насельніцтва камітэта Вольга ТАРАСЮК.**

**Адвакат юрыдычнай кансультацыі Заводскага раёна Мінскай гарадской калегіі адвакатаў Ларыса ТАРАСЕВІЧ-БУРАК** у сваю чаргу адзначае, што ў яе практыцы часта бываюць выпадкі дыскрымінацыі цяжарных жанчын:

— Часцей за ўсё размова ідзе аб прыёме на работу. Што робяць наймальнікі? Калі ёсць падазрэнні, што жанчына збіраецца заводзіць дзяцей, яны не адразу заключаюць кантракт, а бяруць яе на выпрабавальны тэрмін. І калі ўжо дакладна становіцца вядома, што дзяўчына цяжарная, з любой прычыны адмаўляюць ёй у прыёме на пастаяннае месца.

**Святлана КОТАВА, начальнік упраўлення юрыдычнай работы Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі,** расказвае, што яны стараюцца вырашаць праблемныя пытанні на месцах — на прадпрыемствах для гэтага створаны камітэты па працоўных спрэчках. Але ў практыцы прафсаюзаў ёсць выпадкі, калі даводзілася звяртацца ў суд. Напрыклад, у Гродзенскай вобласці наймальнік не збіраўся працягваць працоўныя адносіны з цяжарнай жанчынай па заканчэнні тэрміну кантракта. А на Гомельшчыне мужчыну, які сышоў у водпуск па доглядзе за дзіцем да трох гадоў, звольнілі за прагулы. Абедзве справы былі выйграны.

### Ген супрацІўляльнасці сернай кіслаце

Спіс забароненых для жанчын работ прынята расцэньваць як дадатковы клопат аб здароўі будучых мам. Маўляў, іх не дапускаюць у цяжкія ўмовы, на начную працу, не даюць насіць цяжкасці.

— Для жанчын ёсць абмежаванне на пад'ём цяжкасцяў больш за сем кілаграмаў. А колькі важыць дзіця? — указвае на недасканаласць такіх мер **старшыня праўлення міжнароднай гендарнай арганізацыі «Гендарныя перспектывы» Ірына АЛЬХОЎКА.**

Праўда, спіс цяжкіх работ скарачаецца. Ён пераглядаўся на падставе заяў ад завода «Крышталь», прадпрыемства «Беларуськалій» і іншых арганізацый, дзе жанчыны звярнуліся да кіраўніцтва з просьбай дазволіць ім працаваць на забароненых месцах, бо там аўтаматызавалася вытворчасць. Эксперты ўпэўнены: калі дама спускаецца ў шахту, прыз атрымлівае мужчына, як асноўны работнік. Бо ў палепшаных умовах і яму лягчэй працаваць.

— Я не веру, што ў мужчын ёсць ген супрацІўляльнасці сернай кіслаце. Шкодныя вытворчасці гэтак жа небяспечныя для іх, як і для жанчын, — кажа Ірына Альхоўка. — У Еўропе, Амерыцы, Канадзе адмаўляюцца ад спісаў забароненых прафесій. Замест гэтага яны паляпшаюць умовы працы.

### Мужчыны сябе пераацэньваюць?

Цікава, што па афіцыйнай статыстыцы жанчыны больш паспяховыя ў працаўладкаванні, чым мужчыны. Сярод сталічных беспрацоўных дам — толькі 26 працэнтаў.

— Жанчыны больш рэальна ацэньваюць свае магчымасці, — мяркуе Вольга Тарасюк. — Многія мужчыны, якія прыходзяць да нас у службу занятасці, разлічваюць, маючы толькі прафесію ліцейшчыка трэцяга разраду, якую атрымалі пасля школы, адразу зарабляць па тысячы рублёў. У сённяшніх умовах рынку працы гэта дастаткова высокі ўзровень.

Пра тое, што мужчыны цэняць сябе вышэй, кажа **тэле- і радыёвядучая Тамара ЛІСІЦКАЯ.** «Мне шмат даводзіцца працаваць з рэзюмэ творчых людзей, — дзеліцца яна. — Мужчыны заўсёды просяць большы ганарар, чым жанчыны. Прытым, калі бачыш сітуацыю з боку і ведаеш кваліфікацыю ўсіх гэтых людзей, ты не можаш сказаць, што гэта абгрунтавана».

### 20 дзён для таты

Пісьменніца Вірджынія Вульф неяк разважала: што калі б у Шэкспіра была не менш таленавітая сястра? Яна магла б напісаць такія ж цудоўныя п'есы. Але ў гэты час яна павінна была цыраваць шкарпэткі і гатаваць абеды, бо яе прызначэнне — выйсці замуж і стаць узорнай маці.

Сучасным жанчынам прыходзіцца выбіраць работу, дзе можна спалучаць сямейныя і працоўныя абавязкі. Монакар'ерная сям'я — не рэальнасць беларускага грамадства. У нас 88 працэнтаў жанчын ва ўзросце ад 20 да 44 гадоў знаходзяцца на рынку працы. А з тых, хто мае непаўналетніх дзяцей, працуе 90 працэнтаў.

Водпуск па доглядзе за дзіцем — сур'ёзны выклік для жаночай кар'еры. За тры гады, што мама сядзіць дома з малым, яна можа страціць сваю кваліфікацыю. Эксперты разважаюць: лепш, бадай, было б скараціць дэкрэтны (у Еўропе ён доўжыцца ўсяго чатыры месяцы), а замест гэтага развіваць сетку дзіцячых садкоў. І заахвочваць да сямейных абавязкаў татаў. У Беларусі цяпер разглядаецца пытанне аб увядзенні абавязковага сацыяльнага водпуску па доглядзе за дзіцем для мужчын. Размова ідзе пра 20 дзён. У Швецыі, дзе была рэалізавана падобная прапанова і працуе эканамічны стымул (калі бацька не скарыстаецца сваёй часткай дэкрэтнага, сям'я страціць грошы), 75 працэнтаў мужчын бяруць сацыяльны водпуск.

— Нам трэба гаварыць пра тое, чаму тата важны для дзіцяці, — упэўнена Ірына Альхоўка. — У нас усюды жаночае выхаванне: у сям'і, дзіцячым садку, школе. Больш за тое, мне здаецца, у абавязковым сацыяльным водпуску ёсць вялікая выгада для саміх мужчын — стаць часткай жыцця свайго дзіцяці.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

# З МЕДАЛЁМ... У ПРОФІЛЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Штогод універсітэты краіны абнаўляюць свой студэнцкі састаў на чвэрць. Для ВНУ, якія рыхтуюць педагагічныя кадры, якасныя вынікі ўступнай кампаніі асабліва важныя, паколькі менавіта ад добрага выхавальніка і настаўніка залежыць у многім будучыня краіны.

### Усе месцы занятыя!

Яшчэ тры гады таму сітуацыя з якасцю набору на педагагічныя спецыяльнасці была амаль крытычная: студэнтамі станавіліся абітурыенты з вельмі нізкімі прахаднымі баламі, а часта не маглі запоўніцца нават бюджэтныя месцы.

Але ў апошнія два гады сітуацыя сур'ёзна палепшылася. І конкурсы, і прахадныя балы на педагагічныя спецыяльнасці растуць. Усё часцей іх выбіраюць школьныя медалісты і выпускнікі ліцэяў і гімназій. Аляксандр Жук прыводзіць гэтаму некалькі тлумачэнняў.

Па-першае, ВНУ, якія рыхтуюць педагогаў, сталі больш сур'ёзна ставіцца да прафарыентацыйнай работы, старанна яе планаваць, прымяняць новыя формы — дзейнічаць праз сацыяльныя сеткі, выкарыстоўваць для прыцягнення абітурыентаў установы адукацыі, дзе будучыя педагогі праходзяць педпрактыку, арганізоўваць «школы юных», экскурсіі для старшакласнікаў у ВНУ, сумесныя са школамі творчыя праекты і спартыўныя спаборніцтвы, удзельнічаць у падрыхтоўцы старшакласнікаў да ўдзелу ў алімпіядах і конкурсах навуковых работ, задзейнічаць школьнікаў у валанцёрскім руху.

Па-другое, важную ролю адыграў указ кіраўніка дзяржавы, у адпаведнасці з якім медалісты і ўладальнікі дыпломаў ССНУ з адзнакай атрымалі права паступаць на шэраг педагагічных спецыяльнасцяў без уступных выпрабаванняў.

Калі ў 2013 годзе недабор ва ўніверсітэт склаў 264 чалавекі (141 — на дзённую форму і 123 — на завочную), то ў 2015 і 2016 гадах быў забяспечаны стапрацэнтны прыём на бюджэтныя месцы, прычым без абвяшчэння дадатковага набору. Пры гэтым сёлета на 1200 бюджэтных месцаў на дзённым і завочным аддзяленні было пададзена 3365 заяў, гэта значыць, што конкурс сфарміраваўся на ўсіх спецыяльнасцях (у сярэднім два чалавекі на месца).

Самыя высокія конкурсы на дзённую бюджэтную форму навучання склаліся па спецыяльнасцях «Псіхалогія» — 6,9 чалавека на месца, «Практычная псіхалогія» — 2,8, «Фізічная культура» — 2,7, «Лагапедыя» — 2,4, «Пачатковая адукацыя», «Біялогія і хімія» — 2,2 чалавека на месца.

### Узнімаем планку

Па большасці спецыяльнасцяў дзённай (22 з 30) і завочнай (10 з 16) формаў навучання прахадныя балы ў БДПУ істотна выраслі ў параўнанні з папярэднім годам: на 50 балаў на «Лагапедыі», на 49 балаў — на спецыяльнасці «Руская мова і літаратура. Замежная мова».

— Асабліва радуе нас рост прахадных балаў на спецыяльнасцях «Матэматыка і інфарматыка», «Фізіка і інфарматыка», «Пачатковая адукацыя», паколькі ў 2013 годзе па згаданых спецыяльнасцях БДПУ не выканаў план прыёму, а ў 2014 годзе, каб запоўніць бюджэтныя месцы, спатрэбіўся дадатковы набор, — падкрэслівае Аляксандр Жук.

Сёлета ў галоўны педагагічны ўніверсітэт краіны паступілі 315 выпускнікоў ліцэяў і гімназій — гэта на 17 працэнтаў перавышае мінулагодні лічбы і на 57% — паказчык 2014 года.

Вынікі апошняй прыёмнай кампаніі абвяргаюць стэрэатып пра тое, што прафесія педагога — пераважна, жаночая. У БДПУ назіраецца значнае павелічэнне сярод студэнтаў юнакоў. Сярод першакурснікаў узору 2016 года амаль 30 працэнтаў хлопцаў. На гістарычным і фізіка-матэматычным факультэтах іх больш як 40 працэнтаў, а на факультэце фізічнага выхавання хлопцаў больш як 60 працэнтаў ад агульнай колькасці навабранцаў.

### Паспяховы школьнік — добры студэнт

— Тыя два гады, якія мінулі пасля ўнясення змяненняў у Правілы прыёму, пацвердзілі правільнасць рашэння аб увядзенні льгот для абітурыентаў-медалістаў, — сцвярджае Аляксандр Жук. — Сярод паступаючых на педагагічныя спецыяльнасці іх колькасць вырасла амаль у 1,5 раза практычна ва ўсіх ВНУ. Але многіх цікавіць пытанне, як жа яны навучаюцца? У БДПУ правялі маніторынг паспяховасці залічаных без уступных выпрабаванняў медалістаў. **Сярэдні бал студэнтаў, якія паступілі ў 2015 годзе без экзаменаў, па выніках двух сесій склаў 7,9 бала.** Прычым на гуманітарных спецыяльнасцях — больш як 8 і нават больш як 9 балаў. На факультэтах спецыяльнай адукацыі, пачатковай адукацыі і фізіка-матэматычным — каля 7 балаў.

У БДПУ прааналізавалі таксама і паспяховасць студэнтаў дзённай формы навучання, якія былі залічаны ва ўніверсітэт без экзаменаў у 2014 годзе. Сярэдні бал па выніках чатырох сесій такі самы — 7,9, але выразна прасочваецца дынаміка паляпшэння іх паспяховасці на другім курсе: з 7,5 да 8,2.

— Даныя маніторынгу сведчаць, што дзякуючы ўведзенай норме Правілаў прыёму мы атрымалі добрых студэнтаў з кола медалістаў, якія прызвычаіліся сістэматычна і адказна працаваць, пачынаючы з першага класа, і якія, я ўпэўнены, стануць добрымі педагогамі, — дадаў рэктар Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта.

### Будучая змена

Асобна Аляксандр Жук спыніўся на стварэнні вучэбна-навуковага інавацыйнага кластара бесперапыннай педагагічнай адукацыі, адна з задач якога — прыцягненне ў педагагічную прафесію падрыхтаванай і матываванай моладзі. Размова ідзе пра арганізацыю профільнага навучання педагагічнай скіраванасці і адраджэнне педагагічных класаў.

Навучэнцы ў педагагічных класах і групах вывучаюць два-тры вучэбныя прадметы на павышаным узроўні. Як правіла, гэта тыя прадметы, настаўнікамі якіх яны плануюць стаць у будучыні. Акрамя таго, старшакласнікі павінны абавязкова засвоіць праграму факультатыва «Уводзіны ў педагагічную прафесію» аб'ёмам 140 вучэбных гадзін за два гады. Наведваць факультатыўны курс можна або цэлым класам, або ў складзе педагагічных груп з навучэнцаў розных класаў ці нават з розных школ, зацікаўленых у атрыманні педагагічнай прафесіі.

У 2015 годзе ў краіне было створана больш як 115 педагагічных класаў і груп з колькасцю навучэнцаў больш як 1600 чалавек. Лідарамі ў гэтым кірунку былі Віцебская, Мінская і Гродзенская вобласці. Пасля года работы педагагічных класаў і груп інтарэс да іх вырас удвая. У бягучым навучальным годзе колькасць педагагічных класаў і груп істотна павялічылася: усяго было створана 217 дзясятых педагагічных класаў. Такім чынам іх стала ўжо 319, а навучэнцаў — 3542.

Вынікі праведзенага маніторынгу парадавалі: трэцяя частка дзесяцікласнікаў ужо вызначылася з выбарам педагагічнай прафесіі (34%), прыкладна палова яшчэ думаюць і чакаюць унясення змяненняў у Правілы прыёму. Мяркуецца, што выпускнікі педагагічных класаў змогуць паступаць на педагагічныя спецыяльнасці без уступных іспытаў. Але для гэтага ім, акрамя абавязковага наведвання факультатыву, трэба мець па ўсіх прадметах у атэстаце адзнакі ад 7 да 10 балаў, а па профільных прадметах, якія вывучаюцца на павышаным узроўні, — не менш як 8 балаў.

Рэктар БДПУ лічыць, што гэта дастаткова жорсткія патрабаванні, паколькі нават у найлепшых ліцэях і гімназіях толькі крыху больш за палову выпускнікоў маюць па профільных прадметах ацэнкі вышэй за 8 балаў. І, нарэшце, кожны прэтэндэнт на льготу павінен будзе атрымаць разгорнутую характарыстыку-рэкамендацыю, зацверджаную педсаветам. Гэта значыць, што школа нясе поўную адказнасць за аб'ектыўнасць выдадзенай рэкамендацыі. «Уключэнне гэтай нормы ў Правілы прыёму дазволіць вырашыць задачу, пастаўленую Прэзідэнтам, — адабраць на педагагічныя спецыяльнасці добра матываваных і падрыхтаваных абітурыентаў», — падкрэслівае Аляксандр Жук.

Сёння 3,5 тысячы навучэнцаў, а таксама іх бацькі і педагогі чакаюць унясення змяненняў у Правілы прыёму. Першы масавы выпуск педагагічных класаў адбудзецца ў 2017 годзе. І хацелася б, каб абяцанні, дадзеныя падлеткам, не аказаліся пустымі словамі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
1 снежня 2016 г.
ЧАЦВЕР
№ 22 (15806)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

# Надзея ПРАЦЬКО: «Адкрый сваё сэрца!»

**Гурт «PAWA» быў створаны пяць гадоў таму. З таго часу яго ўдзельнікі суадносяць сваю творчасць з беларускімі народнымі традыцыйнымі спевамі і адаптуюць іх да сучаснасці з дапамогай рока і электроннай аранжыроўкі. Гурт «Нельга забыць», у сваю чаргу, названы ў гонар аднаго з найлепшых твораў Уладзіміра Караткевіча. Усё пачыналася з таго, што вершы з аднайменнага рамана былі пакладзены на музыку, а затым і санеты Максіма Багдановіча. Надзея ПРАЦЬКО — скрыпачка і вакалістка ў абодвух гэтых гуртах.**

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*



На адным з выступленняў «Нельга забыць».

Нябачныя масты

# МОЛАДЗЬ ЗАЎСЁДЫ ЗНОЙДЗЕ ПАРАЗУМЕННЕ

## І межы для яе — не перашкода



Мемарандум аб супрацоўніцтве падпісалі першы сакратар ЦК БРСМ Андрэй Белякоў і старшыня Нацыянальнага савета маладзёжных арганізацый Азербайджанскай Рэспублікі Сеймур Гусейнаў.

Другі фінал конкурсу «100 ідэй для СНД» пройдзе ў Беларусі ў першым паўгоддзі 2018 года. Такое рашэнне было прынятае ў Баку, на пасяджэнні Савета па справах моладзі дзяржаў-удзельніц СНД. Беларусь у сталіцы Азербайджана прадстаўлялі **член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, першы сакратар ЦК грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі», член Савета па справах моладзі СНД Андрэй БЕЛЯКОЎ і начальнік упраўлення па справах моладзі Міністэрства адукацыі Наталля ПШАНІЧНАЯ.**

Мы сустрэліся з імі, каб задаць некалькі пытанняў:

***1. Што ўяўляе сабой Савет па справах моладзі СНД і якія задачы ён вырашае?***

***2. Які працяг атрымае праект «100 ідэй для СНД»? Ці ёсць ужо прыклады паспяховай рэалізацыі ідэй фіналістаў?***

***3. Як вядзецца падрыхтоўка да XIX Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў?***

***4. Традыцыйна краіна, абраная месцам правядзення Савета, дзеліцца з усімі сваім досведам у рэалізацыі маладзёжнай палітыкі. Што асабліва ўразіла ў Азербайджане?***

***5. Што яднае і што раз'ядноўвае сёння моладзь у краінах СНД?***

*(Працяг тэмы на 2-й стар. «ЧЗ».)*

Знаёмства з прафесіяй

# УБАЧЫЦЬ «КАРЦІНУ» ЗЛАЧЫНСТВА

## ГЭТАЙ НАВУКАЙ ВАЛОДАЮЦЬ ЭКСПЕРТЫ-КРЫМІНАЛІСТЫ

**Карэспандэнты «Чырвонкі. Чырвонай змены» наведалі Мінскі міжраённы аддзел Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз і пагутарылі з маладымі спецыялістамі — лейтэнантамі юстыцыі, судовымі экспертамі. Яны падзяліліся першымі ўражаннямі аб працы, расказалі, з якімі цяжкасцямі паспелі ўжо сутыкнуцца, і растлумачылі, чым у крыміналістыцы тэорыя можа адрозніваецца ад практыкі.**

— У Акадэміі МУС сярод факультэтаў міліцыі, крымінальна-выканаўчага і следча-экспертнага я, не сумняваючыся, выбраў апошні. Напэўна, сваю ролю тут адыгралі і шматлікія фільмы пра работу крыміналістаў, і нейкая «таямнічасць» прафесіі, — згадвае падзеі пяцігадовай даўнасці Аляксей Яцкевіч.

— А на мой выбар паўплываў сусед, які працаваў у падобных падраздзяленнях. Мне заўсёды падабалася яго форма, ваенная выправа і мужнасць, — падтрымаў размову яшчэ адзін малады спецыяліст Мікалай Ярашэнка.

...Працоўны дзень судовага эксперта пачынаецца з інструктажу, заступлення на дзяжурства. Графік — з 9 да 18. «На суткі» спецыялісты прыходзяць да 8 гадзін раніцы.

— Спачатку было цяжка не спаць ноччу, але з часам уцягваешся. Што зробіш — служба, — каментуе Аляксей.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*



Фота Надзеі БУЖАН.

Навaспечаныя крыміналісты і іх куратары абмяркоўваюць доказы новай справы.

Андрэй БЕЛЯКОЎ:

# «НАША СІЛА — У СУПРАЦОЎНІЦТВЕ»



1 — Усё падчас сустрэч членаў маладзёжнага Савета адбываецца дэмакратычна і ніхто нікому не навязвае свой пункт погляду. Кожная краіна можа далучацца да тых праектаў, якія цікавыя, найперш, для яе моладзі. Старшынства ў Савеце таксама перадаецца штогод ад адной краіны іншай, так бы мовіць, па крузе. Беларусь выступала ў гэтым статусе ў 2014 годзе. У Баку было вырашана, што на бліжэйшы час старшынёй Савета будзе віцэ-міністр Казахстана па справах рэлігій і грамадзянскай супольнасці Абзал Нікенаў. Адносна нядаўна ў гэтай краіне было створана Міністэрства па справах рэлігій і грамадзянскай супольнасці, якому перадалі паўнамоцтвы ў сферы маладзёжнай палітыкі.

2 — Праект «100 ідэй для СНД» змог аб'яднаць самых смелых і амбіцыйных аўтараў інавацыйных маладзёжных ініцыятыў на прасторах СНД. На сайце Выканаўчага камітэта СНД створана спецыяльная тэматычная старонка, прысвечаная міжнароднаму праекту, дзе можна пазнаёміцца з удзельнікамі фінальнага этапу конкурсу, фота-, відэаматэрыяламі і навінамі аб праекце.

У фінальнай частцы інтэлектуальнага спаборніцтва быў прадстаўлены, напрыклад, праект маладых супрацоўнікаў Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі — анлайн-сэрвіс для прасоўвання і продажу комплексу паслуг у сферы медыцынскага турызму «Клінікі Беларусі» і адаптаваная мабільная праграмы да яго. Меркавалася, што асноўнымі карыстальнікамі сэрвісу будуць замежныя грамадзяне, якія захочуць атрымаць высокакваліфікаваную медыцынскую дапамогу ва ўстановах аховы здароўя Беларусі. А магчымасці анлайн-кансультавання дазволяць людзям, якія занятыя сваёй кар'ерай і цэняць уласны час, не выходзячы з дому, атрымліваць кансультацыі спецыялістаў. Усе надзеі, звязаныя з праектам, цалкам спраўдзіліся: за паўгода яго рэалізацыі ў нашу краіну прыехалі больш як 700 пацыентаў з краін СНД, а дзяржава атрымала рэальны прыбытак. Больш таго, праект дазваляе стварыць пазнавальны медыцынскі брэнд Беларусі і падтрымліваць імідж развітай высокатэхналагічнай дзяржавы ў гэтай сферы.

Ці вось яшчэ адзін прыклад эфектыўнасці маладзёжных ідэй: дзякуючы праекту «Інтэрактыўны музей «Галінскія ветразі», які ў фінале абараняла аспірантка Чарапавецкага дзяржаўнага ўніверсітэта Надзея Токарава, не толькі стымулюецца цікаўнасць да гісторыі роднага краю, але і ствараюцца новыя працоўныя месцы на тэрыторыі сельскай мясцовасці ў суседняй краіне.

3 — У Сочы будзе працаваць міжнародная каманда валанцёраў у складзе 500 чалавек. І ў беларусаў ёсць магчымасць да яе далучыцца. **Рэгістрацыя ахвотных ужо распачалася на сайце фестывалю http://www.russia2017.com.** Перавага, канешне, будзе аддавацца маладым людзям з веданнем некалькіх замежных моў і досведам валанцёрскай работы на падобных міжнародных мерапрыемствах. У беларускіх хлопцаў і дзяўчат такі досвед ёсць. Магутнай школай для іх стаў удзел у якасці валанцёраў на Чэмпіянаце свету па хакеі ў 2014 годзе і іншых міжнародных спартыўных спаборніцтвах, якія ў апошнія гады праводзіліся ў Беларусі. Падрыхтоўка валанцёраў да хакейнага форуму вялася ў нас амаль год. У Расіі таксама пасля завяршэння рэгістрацыі і адбору будзе праходзіць навучанне кандыдатаў. Я б параіў моладзі не ўпускаць такую ўнікальную магчымасць. Яшчэ раней мы абмяркоўвалі з нашымі партнёрамі з Казахстана ўдзел беларускіх валанцёраў у выстаўцы «ЭКСПА—2017», якая будзе праходзіць у наступным годзе ў Астане. Мы выязджалі на аб'екты будаўніцтва — іх маштабы ўражваюць. Краіна вельмі сур'ёзна рыхтуецца да гэтай падзеі.

4 — У Азербайджане моладзь складае 27 працэнтаў насельніцтва, і маладзёжная палітыка там — у прыярытэце. У краіне дзейнічаюць каля 300 маладзёжных неўрадавых арганізацый. Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі падпісаў мемарандум з Нацыянальным саветам маладзёжных арганізацый Азербайджанскай Рэспублікі, дзе пазначаны асноўныя напрамкі для маладзёжнага супрацоўніцтва: гэта валанцёрская дзейнасць, развіццё маладзёжнага прадпрымальніцтва, занятасць моладзі (садзейнічанне другаснай занятасці, развіццё дзейнасці студатрадаў), інфармацыйная работа (абмен вопытам у галіне рэалізацыі інтэрнэт-праектаў і праектаў, звязаных з выкарыстаннем сацыяльных сетак), работа з сельскай моладдзю (рэалізацыя праектаў па стварэнні роўных магчымасцей для ўсіх маладых людзей, якія пражываюць у сельскай мясцовасці).

Хачу зазначыць, што ў Азербайджане нас вельмі зацікавіў досвед правядзення там першых Еўрапейскіх гульняў, і, у прыватнасці арганізацыя валанцёрства, таму што ў 2019 годзе ў Беларусі пройдуць другія Еўрапейскія гульні. Нам расказалі, што ў рамках гэтага спартыўнага форуму працавалі 17 тысяч валанцёраў — гэта найвялізарнейшы аб'ём працы. І добра, што нам не давядзецца «вынаходзіць веласіпед», а можна будзе пазычыць карысны досвед у сваіх сяброў плюс дабавіць туды нешта сваё, каб атрымалася не горш.

5 — Для нас вельмі важна не варыцца ў сваім катле, а браць штосьці з чужога досведу і дзяліцца сваім, каб упэўнена рухацца наперад. Моц маладзёжнага руху — у супрацоўніцтве. Упэўнены, што трэба наладжваць міжнародны абмен у самых розных напрамках, не толькі ў рамках СНД. Мы сёння праводзім шматвектарную палітыку. Цікаўнасць для нас прадстаўляе як досвед Кітая, так і досвед еўрапейскіх краін. У нашых бліжэйшых планах значыцца падпісанне пагадненняў з рознымі маладзёжнымі аб'яднаннямі краін Заходняй Еўропы.

Так, у нас шмат пазычана з савецкага мінулага (узяць той жа студатрадаўскі рух), але разам з тым мы шмат бяром і ў еўрапейскіх калег: гэта тычыцца валанцёрства і трэнінгавай работы.

Студатрадаўскі рух традыцыйна моцны ў дзвюх краінах — Беларусі і Расіі, і мы з нашымі суседзямі актыўна супрацоўнічаем у гэтай сферы, абменьваемся атрадамі. Наш досвед прэзентуецца практычна на кожным Савеце, і зерне, якое мы сеем, прыносіць плады. Летам, напрыклад, сем студэнтаў з Казахстана працавалі ў складзе студатрадаў на будаўніцтве Беларускай АЭС у Астраўцы. Але нам хацелася б больш сур'ёзнага ўзаемадзеяння, каб не толькі да нас прыязджалі нашы сябры з СНД, але каб і беларускія студэнты выязджалі ў гэтыя краіны. Тым больш што менавіта на тэрыторыі Казахстана ў савецкія часы нарадзіўся і сфарміраваўся студатрадаўскі рух: у 50 гады XX стагоддзя студэнтаў з усяго Саюза мабілізоўвалі на асваенне цалінных земляў у гэтай савецкай рэспубліцы.

Напрыканцы кастрычніка я ўдзельнічаў у спецыяльнай маладзёжнай сесіі «Свет. XXI стагоддзе» ў Астане, якая праходзіла ў рамках Маладзёжнага савета Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Там быў падпісаны Мемарандум аб супрацоўніцтве паміж БРСМ і найбуйнейшым грамадскім аб'яднаннем у Казахстане «Маладзёжным крылом «Жас Отан» пры партыі «Нұр Отан». У прыватнасці, мы дамовіліся аказваць адзін аднаму падтрымку ў валанцёрскім руху, маладзёжным прадпрымальніцтве, развіцці інавацыйнай і навуковай дзейнасці, занятасці моладзі.

У Казахстане, напрыклад, рэалізуецца прэзідэнцкая праграма на высадцы дрэў. Гэта справа даверана моладзі. У нас таксама студэнцкія атрады задзейнічаны на пасадках лесу. Канешне, мы прапаноўвалі самыя розныя напрамкі для супрацоўніцтва, паколькі ў Беларусі паспяхова дзейнічаюць і будаўнічыя, і педагагічныя, і сэрвісныя, і медыцынскія, і археалагічныя, і валанцёрскія атрады...

Мы ўвогуле прыходзім да высновы, што ў рамках СНД усе адчуваюць патрэбу адно ў адным. Два дзясяткі гадоў грамадзяне нашых краін ездзілі вандраваць і адпачываць у Турцыю і Егіпет, у той час як у Грузіі, Арменіі, Казахстане, Азербайджане, Расіі ёсць проста непаўторныя мясціны. Трэба сябраваць, тады і развівацца нам усім будзе прасцей.

*(Працяг. Пачатак тэмы на 1-й стар. «ЧЗ».)*



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Праект «100 ідэй для СНД» аб'яднаў самых смелых і амбіцыйных аўтараў інавацыйных маладзёжных ініцыятыў на прасторах СНД.**

Наталля ПШАНІЧНАЯ:

# «УСЕ ЗАЦІКАЎЛЕНЫ Ў ЗБЛІЖЭННІ»...



1 — У маладзёжнага Савета ёсць адно істотнае адрозненне ад іншых Саветаў СНД: ён збіраецца не менш як два разы на год. Пасля абмеркавання ўсе сышліся на думцы, што калі мы будзем збірацца радзей, то праца Савета можа стаць неэфектыўнай. Дынаміка нашых сустрэч задае дынаміку нашай дзейнасці.

Савет па справах моладзі застаецца не толькі ўнікальнай пляцоўкай для зблізэння моладзі нашых дзяржаў, але і пляцоўкай для пошуку наватарскіх ідэй для рэалізацыі патэнцыялу моладзі на прасторах СНД. Задачы, якія стаяць перад Саветам, самыя разнастайныя: ад аб'яднання намаганняў дзяржаў у вывучэнні праблем моладзі да актыўнага ўцягвання маладых людзей у развіццё інтэграцыйных працэсаў.

2 — Упершыню прапанова аб рэалізацыі маладзёжнага праекта «100 ідэй для СНД» была агучана на Савеце, які праходзіў у Мінску ў лістападзе 2013 года. А ў красавіку бягучага года на базе Нацыянальнай бібліятэкі ўжо прайшоў яго фінал, які сабраў хлопцаў і дзяўчат з шасці краін: Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана і Расіі — пераможцаў нацыянальных этапаў. Усяго на мінскай пляцоўцы былі прадстаўлены 38 самых цікавых ідэй. Работы маладых інаватараў былі падзелены на восем напрамкаў: «Прамысловыя тэхналогіі і вытворчасць», «Хімічныя тэхналогіі і біятэхналогіі», «Культура», «Адукацыя», «Ахова здароўя», «Медыцына, медыцынская тэхніка і тэхналогіі, фармацыя», «Інфармацыйныя тэхналогіі (IT-сфера)» і «Гасціннасць: турызм і нацыянальная культура».

Між іншым, ужо падрыхтаваны праект новага Палажэння аб конкурсе «100 ідэй для СНД». Вырашана праводзіць яго раз у два гады. На працягу 2017 года кожная краіна арганізуе свае нацыянальныя этапы. Да таго ж вырашана зрабіць экспертную супольнасць, якая ацэньвае прадстаўленыя ў фінале ідэі, міжнароднай. Ніякіх прэтэнзій да экспертнага савета, у склад якога ўваходзілі вядомыя навукоўцы, супрацоўнікі Акадэміі навук Беларусі і Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях, прадстаўнікі бізнесу і рэальнага сектара эканомікі, не было. Іх кампетэнтнасць і аб'ектыўнасць ніхто не ставіць пад сумненне, але міжнародны экспертны савет павысіць статус гэтага праекта. На Савеце было таксама вырашана звярнуцца ў Міждзяржаўны фонд гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД з просьбай аб дапамозе ў фінансаванні мерапрыемстваў міжнароднага этапу праекта.

3 — XIX Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў адбудзецца ўжо зусім хутка — у кастрычніку 2017 года ў Сочы. У фестывалі возьмуць удзел больш як 20 тысяч удзельнікаў з пяці кантынентаў. Фестываль па традыцыі аб'ядноўвае найбольш прагрэсіўную моладзь планеты — лідараў маладзёжных арганізацый, прадстаўнікоў творчых прафесій, спартсменаў, інжынераў-вынаходнікаў, маладых навукоўцаў, палітыкаў, журналістаў і многіх іншых. Мяркуецца, што ў склад беларускай дэлегацыі на фестывалі ўвойдуць каля 300 прадстаўнікоў.

4 — Для ўвасаблення ў жыццё праектаў і ідэй моладзі пры Прэзідэнце Азербайджанскай Рэспублікі створаны Фонд моладзі, які вельмі добра падмацаваны фінансамі. Фонд прымае заяўкі на праекты і ад юрыдычных, і ад фізічных асоб. Прэтэндаваць на яго сродкі могуць як грамадскія аб'яднанні, так і асобныя грамадзяне, якія пражываюць, напрыклад, у самым аддаленым населеным пункце: заяўкі прымаюцца ў электронным выглядзе, таму доступ да сродкаў фонду ёсць абсалютна ва ўсіх, а не толькі ў тых, хто знаходзіцца да сталіцы бліжэй у геаграфічным плане. Адбор адбываецца на конкурснай аснове. Атрымліваецца, што, выбіраючы праекты, моладзь скіроўвае іх у пэўным напрамку. Заўважу, што грамадзянска-патрыятычнаму выхаванню і праектам гэтай накіраванасці там надаецца вельмі шмат увагі. Фонд існуе ўсяго некалькі гадоў, але зроблена ўжо вельмі многа.

Яшчэ адзін цікавы праект — будаўніцтва па ўсёй краіне Дамоў моладзі. Іх ужо 38, і яны пакрываюць раўнамерна ўсю тэрыторыю краіны. Дамы моладзі працуюць у тым ліку і з дзецьмі, і чымсьці нагадваюць нашы ўстановы дадатковай адукацыі. Але іх функцыі значна шырэйшыя, гэта фактычна шматфункцыянальныя цэнтры па рабоце з моладдзю. Скажам, нейкае грамадскае аб'яднанне хоча правесці сваё мерапрыемства, напрыклад вучэбны семінар: яны падаюць заяўку, і ім выдзяляецца адпаведнае памяшканне з усімі ўмовамі — крэсламі-трансформерамі, мультымедыйным абсталяваннем і гэтак далей. Ці, напрыклад, хтосьці хоча правесці выставу дзіцячых малюнкаў... У Дамах моладзі дзейнічаюць і гурткі, і пакой псіхалагічнай дапамогі, кансультуе лагапед... Там можна праводзіць дыскатэкі, літаратурныя вечарыны, арганізоўваць кінасеансы. Уся прастора прадастаўлена хлопцам і дзяўчатам, і ніхто ўжо не можа сказаць, што моладзі некуды пайсці і няма дзе сабрацца.

5 — У Баку былі агучаны вынікі сацыялагічнага даследавання «Вобраз мінулага і будучага ў свядомасці моладзі». Яго ініцыятыва належала дырэктару Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ, прафесару Давіду Ротману, які каардынаваў падобную работу яшчэ на ўзроўні Савецкага Саюза. Але вырасла ўжо цэлае пакаленне моладзі, якое і нарадзілася, і выхоўвалася ў суверэнных краінах. Цікава было параўнаць меркаванні той і цяперашняй моладзі па многіх аспектах, у тым ліку і іх жыццёвых каштоўнасці і прыярытэты. Канешне, на поўную аб'ектыўнасць даследаванне не прэтэндуе, паколькі апытаннем была ахоплена толькі студэнцкая моладзь, але з упэўненасцю можна сказаць адно — маладыя людзі зацікаўлены ў збліжэнні. У адрозненне ад савецкіх часоў сёння адчуваецца востры дэфіцыт інфармацыі пра суседзяў па СНД: пра іх культуру, гісторыю і традыцыі. А цікаўнасць з боку маладых людзей ёсць. Прычым цікаўнасць вялікая...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

Голас маладых

# ЗАЎСЁДЫ ГАВАРЫЦЬ ПРАЎДУ

## Гэта найпершае, што павінны ўсвядоміць маладыя журналісты

**Сёлета Форум маладых журналістаў прайшоў ужо пяты раз. Пераможцамі конкурсу «Дэбют», які штогод праходзіць у яго рамках, сталі некалькі дзясяткаў хлопцаў і дзяўчат — юных супрацоўнікаў СМІ. Гэта амаль што цэлая рэдакцыя! А значыць, можна падводзіць пэўныя вынікі. Аб высновах мы пагаварылі з Сяргеем СВЕРКУНОВЫМ, намеснікам старшыні Беларускага саюза журналістаў.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

### У пошуках ісціны

Ініцыятыва стварыць такую пляцоўку для абмену вопытам паміж сталымі і маладымі супрацоўнікамі СМІ належыць Міністэрству інфармацыі і Беларускаму саюзу журналістаў. Сяргей Дзмітрыевіч расказвае, што паміж тымі юнакамі і дзяўчатамі, якія падавалі свае работы пяць гадоў таму, і сёлетнімі ўдзельнікамі прагледжваецца значны прафесійны рост.

— Сёння мы бачым, што конкурс набраў сілу. Работы, якія нам даслалі, вылучаюцца высокай якасцю. Штогод мы прымаем іх каля 30—40. Больш за палову — з рэгіянальных СМІ, у тым ліку з мясцовага тэлебачання. Калі іх параўноўваць з тымі, першымі, мы бачым, што гэтыя гады не прайшлі дарэмна. Я лічу, што конкурс карысны ў першую чаргу для тых, хто змог паўнавартасна паўдзельнічаць ва ўсёй праграме форуму. У іх быў час пазнаёміцца, абмяняцца кантактамі і стварыць своеасаблівую прафесійную сетку. Гэта ўжо калегі, якія абмяркоўваюць разам праблемы і дасягненні.

— На другім форуме, у Магілёве, я ўдзельнічаў у ток-шоу, — працягвае Сяргей Сверкуноў, — і адказваў на пытанне «Якое крэда павінна быць у журналіста?». Упэўнены, што на першае месца трэба ставіць праўду і аб'ектыўнасць. Ісціну знайсці цяжка, але праўду трэба гаворыць заўсёды. Галоўнае — пісаць, не скажаючы факты.

### Сустрэнемся ў прэс-клубе

У конкурсе «Дэбют» могуць удзельнічаць маладыя журналісты да 33 гадоў. Тлумачыцца гэта ў тым ліку тым, што не ўсе прыходзяць у прафесію адразу пасля інстытута. Ёсць даволі шмат моладзі з прафесійным вопытам у іншых сферах. Яны ўжо папрацавалі на вытворчасці ці ў сельскай гаспадарцы, а зараз вырашылі паспрабаваць сябе ў журналістыцы. У іх таксама ёсць магчымасць праявіць сябе на конкурсе.

Адзін з трэндаў — прывабліванне юнакоў і дзяўчат, якія працуюць у інтэрнэце. На жаль, зараз для іх няма асобнай намінацыі, але тыя, хто робіць інфаграфіку, дызайн сайта ці іншым чынам візуалізуе інфармацыю, могуць дасылаць свае работы ў намінацыю «Лепшы фотакарэспандэнт». Конкурс імкнецца ісці ў нагу з часам, бо маладым спецыялістам ёсць за што змагацца: пераможцаў чакае не толькі дыплом, але і грашовая прэмія!

Важна, што ў гэтых мерапрыемствах за пяць гадоў паўдзельнічалі не толькі беларускія юнакі і дзяўчаты. На пляцоўках форуму таксама збіраліся расіяне, казахі і армяне. Саюз журналістаў чакае, што ў бліжэйшыя гады ў ім прымуць удзел і нашы калегі з Кітая. Другой навіной на форуме стала тое, што ў будучым годзе плануецца адкрыць прэс-клуб для маладых супрацоўнікаў СМІ пад назвай «Журналіст». Аб гэтым на пленарным пасяджэнні расказала міністр інфармацыі Лілія Ананіч, але падрабязнасці праекта пакуль што трымаюцца ў сакрэце.

### Спецыяліст па «вузкіх» тэмах

— Адно з нашых дасягненняў — своеасаблівы «Клуб настаўнікаў». Галоўнае на форуме — гэта магчымасць атрымаць веды ад прафесіяналаў сваёй справы. Абласныя арганізацыі накіроўваюць вопытных журналістаў, каб тыя перадавалі маладым калегам свой вопыт. Часам нават невялікая падказка можа дапамагчы разабрацца ў складанай праблеме. Такія педагогі атрымалі дыплом журналіста-настаўніка. За гэты час ім узнагародзілі каля 30 чалавек, — падкрэслівае Сяргей Сверкуноў.

Саюз журналістаў сочыць за дасягненнямі сваіх пераможцаў. Напрыклад, Вольга Кімель, якая пяць гадоў таму стала лаўрэатам, зараз кіруе «Горецким вестником». Сярод педагогаў мой суразмоўца таксама адзначыў некалькі імёнаў: галоўных рэдактараў «Лепельскага краю» Уладзіміра Шаўчэнку і «Чырвонага праменя» (газета Чашніцкага раёна) Міхаіла Дзеравягу, якія выступалі на пасяджэннях клуба.

Сёлета падчас форуму абмяркоўваліся пытанні маральнага выбару журналіста. А сярод удзельнікаў праводзілася апытанне: якія праблемы ёсць у журналістыцы сёння і якой яна будзе заўтра? Маладыя карэспандэнты адзначаюць, што ім не хапае спецыялізацыі. Свет такі шырокі, што аднаму чалавеку цяжка яго ахапіць. Юнакі і дзяўчаты прадбачаць, што ў будучыні будуць вельмі запатрабаваныя спецыялісты, якія змогуць пісаць на вузкія тэмы, і такіх трэба ўжо сёння рыхтаваць ва ўніверсітэтах.

**Надзея АНІСОВІЧ.**
*anisovich@zviazda.by*

Сярод найлепшых

# «Я там, дзе віруе жыццё»

**Падчас V Форуму маладых журналістаў адным з пераможцаў прэміі «Дэбют» стала загадчык аддзела пісьмаў і зваротаў грамадзян газеты «Івацэвіцкі веснік» Вольга МАЦВЕЕНЯ (ШЭЛЯГОВІЧ), якую прызналі найлепшым рэпарцёрам. Пра свой шлях у журналістыку і жыццёвыя прынцыпы дзяўчына расказала «Чырвонцы. Чырвонай змене».**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

— Я мяркую, што трапіць у нашу прафесію працай, чым у ёй затрымацца, — лічыць Вольга. — Многія выпускнікі сыходзяць з дыстанцыі і кладуць дыплом на паліцу. Мне ў гэтым плане пашчасціла — пасля школы разглядала два варыянты будучыні: вучобу на юрыста ці журналіста. Выбрала другі варыянт, падстрахаваўшыся мэтавым накіраваннем, і гэта работа ў выніку мяне па-сапраўднаму захапіла.

Падчас вучобы студэнтка праходзіла практыку ў розных выданнях, найбольш супрацоўнічала з газетай «Аргументы і факты ў Беларусі» — да таго часу, пакуль не трапіла на практыку ў БЕЛТА, дзе паўтара года працавала паралельна з вучобай ва ўніверсітэце. Пасля заканчэння Інстытута журналістыкі яе размеркавалі ў раённую газету «Івацэвіцкі веснік», якая давала мэтавае накіраванне.

— Раённая газета вучыць падбіраць трапныя словы для аповеду пра простых людзей, якія насамрэч не такія і простыя, а годныя самых высокіх слоў, — сцвярджае Вольга. — Пасля двух гадоў адпрацоўкі ў Мінск я не вярнулася, хоць магчымасць была. Працую ў «Івацэвіцкім вясніку» ўжо сем гадоў, пішу пад дзявочым прозвішчам Шэляговіч. Дарэчы, у гэтай газеце некалі працаваў мой дзядуля, таксама журналіст, пісьменнік Мікалай Васільевіч Банасевіч, так што журналістыка ў мяне «ў крыві». Да таго ж тут мая малая радзіма, тут жывуць мае родныя і блізкія людзі. У Івацэвічах я сустрэла мужа, у нас нарадзілася дачушка — нядаўна ёй споўнілася тры гады, тут знаходзіцца мой дом і віруе жыццё, у якім мне камфортна як жонцы і маці. А калі дома лад, то і на рабоце ўсё атрымліваецца — я так лічу.

Загадчыкам аддзела пісьмаў і зваротаў грамадзян Вольга стала прыкладна год таму, а да гэтага была карэспандэнтам. Ранейшыя абавязкі яна выконвае і цяпер — піша матэрыялы, як і іншыя творчыя супрацоўнікі рэдакцыі. Але з новай пасадай з'явілася шмат «папяровай» работы: рэгістраваць дакументы, рабіць справаздачы, разглядаць звароты грамадзян, разбірацца ў скаргах, падтрымліваць зваротную сувязь з заяўнікамі. Бывае, лісты чытачоў даюць падставу для напісання артыкула, калі праблема сур'ёзная і патрабуецца ўмяшанне СМІ.

— Матэрыялаў на конкурс я падавала некалькі дзясяткаў — найлепшыя з тых, што былі напісаны за апошні час, — кажа Вольга. — Якімі крытэрыямі кіравалася журы, выбіраючы мяне ў якасці лаўрэата, не ведаю. У цэлым жа да ўзнагарод стаўлюся па-філасофску. Ёсць прызнанне з боку калег, кіраўніцтва — цудоўна, вялікі дзякуй, але гэта не самамэта. Найбольш арыентуюся на прызнанне чытача, на яго павагу да маёй пазіцыі.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

Асабістае

# ШЭСЦЬ ЯБЛЫКАЎ

***Апошнім часам усё больш заўважаю, як любяць людзі скардзіцца на жыццё. Падстаў процьма: мала плацяць, недастаткова паважаюць, дрэнна лечаць, спраўна падманваюць, не так, як некалі, кахаюць... Скарга — ці не народная наша забава. Не прынята ў нас хваліцца — каб не пазайздросцілі, крый Божа. А наракаць на жыццё — справа іншая.***

*Не тое, каб я супраць. Але заўважыла, што людзі, якія жывуць з вечнай прэтэнзіяй да жыцця, сталі мяне стамляць. А падчас апошняй такой размовы ўспомніўся мне дзедаў аповед пра шэсць яблыкаў. Было гэта ў даваенны час. Гадкоў майму дзеду Мікалаю было мо 10. І хоць жыў ён у вёсцы, садовыя дрэвы былі там рэдкасцю, не было іх на бацькоўскім падвор'і. І вось на Спас мой прадзед Васіль прынёс у хату шэсць яблыкаў, асвяцілі іх у царкве і паклалі ў прыскрынак куфэрка, каб разносілі водар па ўсёй хаце. Гэты самы водар і давёў да бяды, бо малы Коля не ўтрымаўся перад спакусай і з'еў адразу ўсе шэсць пладоў.*

*Бяда не прымусіла сябе чакаць — праз некалькі гадзін адчуў хлопча болі ў жываце, і пацягнула яго на двор. А потым зноў і зноў. Гэта была крываўка — страшная па тых часах хвароба, бо якое тады магло быць лячэнне ў сялянскай хаце?*

*Павёз бацька адзінага сына ў бальніцу ў Косава (бліжэйшы горад), дзе 12 сутак ставілі яго на ногі. За лячэнне бацька заплаціў 60 злотых. Для сям'і гэта былі вялікія грошы, за іх можна было купіць паўтоны збожжа і жыць цэлы год. А так сын асудзіў сям'ю на голад... Як кажуць, бяда не прыходзіць адна — у марозную лютаўскую ноч згарэла іх хата з усім сціплым дабром, і прытулкам для сям'і стаў куток у хаце суседзяў. Каб пачаць новае жыццё, засеяць поле, прыйшлося жабраваць. Дзед казаў: «Якое гэта цяжкае слова — жабрак. Пакуль сам ім не станеш, напэўна, не зразумееш». І вось пасля аднаго такога паходу па вёсцы, калі чалавек аддаваў перадапошні акраец хлеба ці жменю збожжа, прадзед Васіль сказаў цвёрдае «Не!». Маўляў, больш не пайду па людзях, «Не магу, нажывём, зараблю — і вазьмуся за сваю хату». І ўзяўся, і сам пабудаваў!*

*Усё пазнаецца ў параўнанні. Найхутчэй людзі, якія сёння наракаюць на цяжкае жыццё, і не ведаюць, што такое сапраўдная бяда. А калі яна і сапраўдная, то найхутчэй прывялі да яе нашы памылкі, нашы «шэсць яблыкаў». Нездарма жартуюць людзі: «У мяне ўсё было б добра, калі б не... я». Не ведаю, як каму, але калі мне цяжка на сэрцы, стукае ў скроні тое «Не!» майго мудрага прадзеда, якое з жабрака ператварыла яго ў руплівага гаспадара. Усё ў нашых руках, таму ніколі іх нельга апускаць.*

**Вольга ШЭЛЯГОВІЧ.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
1 12 2016 г.

*На сваім месцы*

# «РУКІ ЗАНЯТЫЯ? НЕ ЗМЕРЗНЕШ!»

## Будаўнік з СВК пра жаданне працаваць

**Вялікія гарады ці не з кожным днём становяцца яшчэ большымі: тут узводзяцца новыя дамы, офісы, школы і дзіцячыя садкі. Таму здаецца, што будаўнік — прафесія перш за ўсё «гарадская». Але вёсцы сёння на пастаяннай аснове таксама патрэбны маладыя спецыялісты ў гэтай галіне. 21-гадовы майстар-будаўнік Іван МАКАЕД расказаў пра сваё жыццё і работу ў СВК «Велута» Лунінецкага раёна.**



Брыгада Івана *(ён першы злева)* не толькі будуе, але і займаецца дэмантажом старых будынкаў у Велуце.

Хлопец прыйшоў сюды летась на адпрацоўку пасля каледжа. Ён лічыць, што яму пашанцавала. Некаторыя аднакурснікі Івана з-за недахопу працоўных месцаў вымушаны былі ўладкавацца звычайнымі будаўнікамі, а хтосьці і ўвогуле атрымаў вольны дыплом.

— Да вясковага жыцця мне не прызвычайвацца: я нарадзіўся і вырас у вёсцы Вялікія Чучавічы, якая знаходзіцца за трынаццаць кіламетраў ад Велуты. І калі многія баяцца размеркавання з-за невядомасці, якая іх чакае наперадзе, то мне нічога новага тут не адкрылася, усё было знаёмым, — расказвае малады майстар.

За Іванам замацавана брыгада з пяці чалавек: трое нядаўніх выпускнікоў каледжа і двое будаўнікоў, якія старэйшыя за брыгадзіра прыкладна на дваццаць гадоў. Ён дае распараджэнні, каардынуе іх работу, сочыць за якасцю выкананага.

— Са старшым пакаленнем працэй: яны мне дапамагаюць, ведаюць тонкасці і нюансы працы, за любое заданне бяруцца без лішніх пытанняў. З маладымі знайсці паразуменне атрымліваецца не заўсёды, часта даводзіцца чуць фразы: «Нас гэтаму не вучылі» ці «Мы не ўмеем». У прафесійна-тэхнічным каледжы даюць толькі «азы». Астатняе спасцігаецца ўжо непасрэдна падчас работы, а тут галоўнае, на мой погляд, — не ўхіляцца ад яе.

Іван працуе шэсць дзён на тыдзень (у суботу толькі да абеду). Кожную раніцу ён атрымлівае ад кіраўніцтва заданне для сваёй брыгады. Працы ў будаўнікоў у СВК хапае, без справы яны не сядзяць ніколі, бо заўсёды трэба нешта адрамантаваць ці перабудаваць.

— Здараецца, што не хапае пэўных будаўнічых матэрыялаў. У такіх сітуацыях мы не чакаем, калі яны з'явяцца, а пераключаемся на іншыя заняткі, якія патрабуюць толькі нашых уменняў. Выкручваемся, нешта прыдумляем, і рукі заўсёды працуюць, — расказвае хлопец. — Халоднае надвор'е, дарэчы, таксама не прычына, каб работа спынілася. Замярзаеш толькі тады, калі стаіш на вуліцы без справы. А мы ж рухаемся ўвесь час, таму ніякі холад нам не замінае.

Самае складанае ў прафесіі майстра, па словах Івана, — гэта запаўняць бланк нарада на здзельную работу ў пачатку кожнага месяца. Згодна з гэтай паперай, брыгадзе налічваюць заработную плату. Працуюць яны па-рознаму, бывае, што ў пэўныя месяцы выконваюць вельмі многа заданняў, але сродкаў, каб за іх заплаціць, у СВК хапае не заўсёды... Тады ў брыгады ўзнікаюць пытанні, і ў першую чаргу да Івана: можа, ён што забыў пазначыць, калі бланк запаўняў? Даводзіцца тлумачыць сітуацыю.

> **«З маладымі знайсці паразуменне атрымліваецца не заўсёды, часта даводзіцца чуць фразы: «Нас гэтаму не вучылі» ці «Мы не ўмеем».**

— Для мяне размовы, якія тычацца фінансавага боку нашай працы, не самыя прыемныя, — прызнаецца хлопец. — Быць будаўніком — справа дакладна нялёгкая, але заробкі ў нас даволі сціплыя. Я атрымліваю каля 270 рублёў, нават мае маладыя падначаленыя з брыгады спачатку больш мелі. З іншага боку, ведаю, што ёсць у нас і тыя, хто з дыпломам аб вышэйшай адукацыі зарабляе менш за мяне.

Летам падчас водпуску Іван не адпачываў, а пайшоў на падпрацоўку ў прыватную фермерскую гаспадарку. Ён прызнаецца, што на ўласныя патрэбы зарплаты не хапае.

— Не скажу, што ў нашай вёсцы так ужо шмат спосабаў патраціць грошы. Хутчэй, наадварот, — разважае малады майстар. — Бацькі дапамаглі купіць аўтамабіль, а ён патрабуе немалых сродкаў. Дома ж на выхадных сядзець не хочацца: у горад, бывае, з сябрамі ездзім ці на дыскатэку ў іншую вёску. На паліва грошы патрэбны, а там на каву ці на білет у клуб.

Адзінае, на чым у Івана атрымліваецца эканоміць, — жыллё. Гаспадарка выдзеліла на чатырох маладых супрацоўнікаў асобны новы дом, які яны паміж сабой называюць інтэрнатам. «Праўда, вахцёра няма, умовы вельмі добрыя, і плацім мы толькі за камунальныя паслугі. Гэта, безумоўна, плюс да працы ў вёсцы, але заўсёды з халастымі калегамі жыць не будзеш, — дзеліцца думкамі Іван. — Пакуль мая дзяўчына вучыцца, таму канкрэтных планаў на бліжэйшую будучыню ў мяне няма. А што далей — час пакажа».

**Ганна КУРАК,**
**студэнтка V курса**
**Інстытута журналістыкі БДУ.**

# УБАЧЫЦЬ «КАРЦІНУ» ЗЛАЧЫНСТВА

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

Працавітасць і мэтанакіраванасць будучых крыміналістаў праяўляецца яшчэ ў сценах Акадэміі. За гады навучання ў групе Мікалая і Аляксея з 27 чалавек толькі адзін «сышоў з дыстанцыі».

— Сустрэлі на рабоце нас, маладых, «зялёных», добра, — смяецца Мікалай. — Старэйшыя калегі парадамі проста закідалі, толькі паспявай занатоўваць.

— У 2011 годзе конкурс сярод дзяўчат быў 50 чалавек на месца. Але я свой шанц не ўпусціла, — з гонарам кажа **Настасся ГЕТМАНСКАЯ, лейтэнант юстыцыі, эксперт крыміналістычнага сектара Маладзечанскага міжраённага аддзела Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз**, якая сёлета таксама скончыла Акадэмію і прыступіла да абавязковай адпрацоўкі.



Судовы эксперт-крыміналіст Настасся Гетманская.

Насця расказвае, што на выбар будучай прафесіі паўплывала цяга да загадак, таямніц. Судовы эксперт з дзяцінства зачытвалася дэтэктывамі.

— Скажу, што дзяўчыне нялёгка вучыцца на «мужчынскім» факультэце. Было складана прывыкнуць да формы, службы, распарадку дня, звальненняў, незвычайнага быту. З часам, вядома, прывыкаеш і нават пачынаеш бачыць у гэтым плюсы, — дзеліцца думкамі Насця.

Дзяўчына прызнаецца, што на рабоце малады спецыяліст атрымлівае шмат інфармацыі. І ўсяму хочацца навучыцца, штосьці даводзіцца чытаць дома, каб не падвесці старэйшых калег.

— Першае дзяжурства было вельмі хвалюючым, але я справілася. Разумееце, у тэорыі на «месцы здарэння» ў цябе ўсё дакладна: па пунктах распісана, што, як, з дапамогай чаго і калі трэба рабіць. На практыцы ж з'яўляецца шмат фактараў, якія збіваюць: недахоп часу, шматлікія пытанні пацярпелых і іншае. Але я разумею, што ўсё наладзіцца з часам.

Прафесіяналізм прыходзіць з вопытам, пацвярджае і куратар наваспечаных крыміналістаў — **маёр юстыцыі, старшы эксперт-крыміналіст Мінскага міжраённага аддзела Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Дзмітрый РАБЦАЎ**:

— Маладым спецыялістам пакуль не хапае вопыту, ад якога залежыць хуткасць выканання экспертыз. А ў нашай справе час адыгрывае важную ролю. Упэўненасць не толькі ў сваіх ведах, але і ў дзеяннях — вось што патрэбна тым, хто толькі прыходзіць да нас. Мы, у сваю чаргу, стараемся дапамагчы маладым калегам замацаваць іх сістэму ведаў, давесці свае дзеянні да аўтаматызму.

Судовы эксперт апрацоўвае спецыяльнымі сродкамі месцы магчымага кантакту злачынца з паверхнямі, прадметамі, фатаграфуе навакольле, дапамагае следчаму адбіраць улікі злачынства. На выклік звычайна прыязджае следча-аператыўная група, якая складаецца з судовага эксперта, следчага, аператыўнага супрацоўніка і кіроўцы-міліцыянера.

— У нашай прафесіі шмат нюансаў. Напрыклад, пры апісанні злепка падэшваў маладыя спецыялісты павінны навучыцца правільна выкладаць свае думкі, каб чалавек збоку зразумеў усю «карціну». На заключэннях экспертаў-крыміналістаў ляжыць вялікая адказнасць, таму права на памылку ў нас няма, — падкрэслівае Дзмітрый.



У спецыяльным чамаданчыку — усё патрэбнае для работы.

Фота Надзеі БУЖАН.

Стаць экспертамі-крыміналістамі могуць і выпускнікі грамадзянскіх ВНУ. Для гэтага неабходна скончыць курсы пры Інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз.

— Маладым судовым экспертам прапануецца інтэрнат або аплачваецца частка ад сумы за арэнду кватэры. Акрамя гэтага, мы маем права на атрыманне льготнага крэдыту на будаўніцтва жылля, можам прэтэндаваць на арэндную кватэру. Водпуск у судовых экспертаў — да 45 дзён, — расказвае Мікалай.

> **Акадэмія МУС — асноўная навучальная ўстанова, адкуль выпускаюцца судовыя эксперты-крыміналісты. Вучоба доўжыцца чатыры гады. Выпускнікі Акадэміі маюць допуск на права правядзення сямі відаў крыміналістычных экспертыз (дактыласкапічную, балістычную, партрэтную, трасалагічную, экспертызу халоднай і кідальнай зброі, почырказзнаўчую і тэхнічную экспертызу дакументаў).**



Судовыя эксперты Дзмітрый Рабцаў і Мікалай Ярашэнка за работай.

Свае заробкі маладыя спецыялісты не агучваюць, але кажуць, што на жыццё ім хапае. Да таго ж і прэмію за добрасумленную працу ніхто не адмяняў.

— Спачатку мужчыны-калегі трохі жартавалі: «Ідзі дамоў, пакуль не позна. Што ты тут забылася?» Але праз тыдзень зразумелі, што гендарныя стэрэатыпы лепей адкінуць: пол на якасць работы не ўплывае. Галоўнае — любіць сваю справу, — дзеліцца Настасся. — Увогуле, дзяўчаты больш адказныя і карпатлівыя. Напрыклад, мне падабаецца праводзіць почырказзнаўчыя экспертызы, у той час як хлопцам у Акадэміі гэты занятак падаваўся сумным.

Наваспечаныя спецыялісты ўсе ў адзін голас кажуць, што вольнага часу ў іх мала. Маладыя судовыя эксперты чытаюць кнігі, у тым ліку па крыміналістыцы, слухаюць музыку, займаюцца спортам.

Настасся не хавае, што вельмі задаволеная месцам свайго размеркавання. Дзяўчына вярнулася на сваю малую радзіму, у Маладзечна. Там бацькі, сябры. Як кажуць, дома і сцены дапамагаюць. Аляксей родам з Нясвіжа. Хлопец прызнаецца, што розніцы, у якім горадзе працаваць, няма. Галоўнае, каб справа прыносіла задавальненне і калектыў падтрымліваў.

— Як кажуць, нам ёсць куды расці і да чаго імкнуцца, — падсумаваў Мікалай. — Будзем старацца. Прыходзьце да нас праз год. Упэўнены: расказаць будзе што.

**Кацярына АСМЫКОВІЧ.**
*asmykovich@zviazda.by*

*Ідэі маладых*

# ТЭСТЫ ДЛЯ ТАБЛЕТАК І ПРАТЭІНАВЫЯ БЛІНЫ

**Новыя лекавыя прэпараты, якія з'яўляюцца на рынку, праходзяць шэраг выпрабаванняў: правяраецца іх таксічнасць і ўздзеянне на арганізм. Над вырашэннем гэтых і многіх іншых праблем сёння працуюць маладыя беларускія вучоныя — свае праекты яны прадставілі на штогадовай канферэнцыі «Моладзь у навуцы».**

— Пры выпрабаваннях выкарыстоўваюцца пераважна паддоследныя жывёлы, чый арганізм можа значна адрознівацца ад нашага, — тлумачыць **старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі навуковай інжынерыі Інстытута біяарганічнай хіміі НАН Яраслаў ДЗІЧЭНКА.** — Напрыклад, той жа азбест для чалавека лічыцца канцэрагенам, а хамякі і трусы без праблем пераносяць уздзеянне гэтага рэчыва. У нашым праекце мы прапануем наступнае рашэнне: штучна атрымліваць бялкі чалавека «ў прабірцы» і праводзіць тэсты на іх.

Сярод плюсоў такога спосабу вучоны называе магчымасць атрымаць абсалютна любы бялок (прычым нават канкрэтнага пацыента), а таксама мадэліраваць уздзеянне прэпарата на любы орган. Сумарны вынік такіх эксперыментаў і дасць адказ на пытанне аб бяспецы прэпарата.



Яраслаў Дзічэнка прапануе тэсціраваць новыя лекі на штучна атрыманых бялках.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Праект, які дапаможа айчынным спартсменам і аматарам здаровага ладу жыцця, прадставілі Ганна Журня (злева) і Хрысціна Рабава.

**Навуковы супрацоўнік аддзела харчавання Навукова-практычнага цэнтра па харчаванні НАН Ганна ЖУРНЯ і кіраўнік групы Рэспубліканскага кантрольна-выпрабавальнага комплексу па якасці і бяспецы прадуктаў харчавання Навукова-практычнага цэнтра па харчаванні НАН Хрысціна РАБАВА** прадставілі на выставе інавацыйныя прадукты для спартсменаў: ізатанічныя напоі, пратэінавыя сумесі для гатавання бліноў і пратэінавыя кактэйлі.

— Цяпер гэты рынак насычаны прадуктамі амерыканскай, канадскай, нямецкай, польскай і расійскай вытворчасці, а вось беларускага харчавання амаль няма, — каментуюць аўтары праекта. — Для стварэння канкурэнтнага асяроддзя і павышэння даступнасці такіх тавараў мы і заняліся гэтай работай. Нашы прадукты ў першую чаргу разлічаны, безумоўна, на прафесійных атлетаў, але спажываць іх могуць усе ахвотныя.

Так, напрыклад, ізатанічныя напоі «ІзаАктыў» прызначаны для папаўнення водна-салевага балансу пасля трэніровак, акрамя гэтага, яны ўтрымліваюць рэчывы прыроднага паходжання, якія спрыяюць хуткаму аднаўленню арганізма пасля фізічных нагрузак, — адаптагены (гэта галоўнае адрозненне ад прадстаўленых на рынку аналагаў). Цяпер выпушчана прамыслова-доследная партыя прадукту, чакаецца атрыманне патэнта. Стваральнікі спадзяюцца, што хутка яго можна будзе ўбачыць у спартыўных крамах па цане, прыкладна на 25 працэнтаў меншай за замежныя аналагі.

Яшчэ адзін цікавы прадукт — пратэінавая сумесь для гатавання бліноў. Па словах навукоўцаў, для многіх спартсменаў праблемай становіцца разнастайнасць меню — харчавацца аднымі кактэйлямі цяжка. Таму і была распрацавана сумесь, што выпускаецца ў пакецiках па 250 грамаў, у якіх утрымліваецца сутачная норма бялкоў для атлетаў. Дастаткова дадаць у змесціва ваду — і можна гатаваць смачную і пажыўную страву.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*




# НЕ ЧАКАЙЦЕ ПАНЯДЗЕЛКА

**Нядаўна навукоўцы вызначылі самы эфектыўны спосаб пахудзець. Чакаеце сенсацыі? Дарма. Даследчыкі правялі эксперымент на трох групах добраахвотнікаў (з нармальнай вагой, залішняй і тымі, хто нядаўна скінуў некалькі кілаграмаў) і прыйшлі да высновы, што трымаць сябе ў форме дапамагае... актыўны лад жыцця.**

Гэта я да чаго? Фітнесам мы ў лепшым выпадку займаемся тры гадзіны на тыдзень (і гэтага ў прынцыпе дастаткова, калі вы не прафесійны спартсмен, — не слухайце тых, хто настойвае, што шчыраваць з гантэлямі трэба кожны дзень). Але тое, як мы праводзім свой час па-за межамі залы, уплывае на фігуру не менш. Таму добра мець не толькі абанемент у трэнажорку, але і карысныя звычкі.

Напрыклад, выбіраць прыступкі лесвіцы замест ліфта. Пры пад'ёме абавязкова абапірайцеся на пятку: правільная тэхніка нагрузіць патрэбныя мышцы. Ідзяце з торбамі ў руках? Выдатна. Мінітрэніроўка з абцяжарваннем лішняй не будзе.

Увесь дзень даводзіцца праводзіць у крэсле? Нічога страшнага, упэўнены брытанскія навукоўцы, нават у гэтай сітуацыі можна знайсці выйсце. Каб не зарабіць сабе цукровы дыябет ці праблемы з сэрцам, трэба праз кожныя паўгадзіны вызваляцца з месца і выконваць простыя практыкаванні, каб размяць мышцы. Праўда, калі ў офісе правесці такую размінку не праблема, то ў вучэбнай аўдыторыі ваша імкненне быць здаровым могуць не ацаніць...

Трэніраваць мышцы прэса на працягу дня можна правільнай тэхнікай дыхання. Сэнс у тым, каб набіраць паветра не грудзьмі, а жыватом. Тонкая талія, дарэчы, не адзіны плюс такой тэхнікі. Даказана, што пры дыханні жыватом у мозг паступае ў восем разоў больш кіслароду.

Пра карысць сну вы, пэўна, чулі не раз (кажуць, хранічны недасып прыводзіць да таго, што мы ўжываем на 40 працэнтаў калорый больш, чым трэба). А ці ведаеце, што лепш прачынацца па першым сігнале будзільніка (вох, самой яшчэ над гэтым працаваць і працаваць) і ўставаць у адзін і той жа час кожную раніцу, нават у выхадныя? Гэта звычка дапамажа наладзіць свой «унутраны гадзіннік» і добра высыпацца. Да таго ж даследчыкі з універсітэта Брыгама Янга (ЗША) высветлілі, што жанчыны, якія кладуцца спаць і прачынаюцца ў адзін і той жа час, больш зграбныя за тых, хто не захоўвае гэта правіла.

Загадзя плануйце, што будзеце есці заўтра, і не саромейцеся складаць «ссабойкі» на работу ці вучобу. Па-першае, не будзеце галоднымі, а падругое — менш рызыкі сарваца на школьныя прадукты і пераесці ўвечары, калі нарэшце даберацеся да халадзільніка.

Для гэтага ж не прапускайце снеданне. Вось толькі не трэба расказваць, што зранку есці зусім не хочацца. Я некалі таксама так апраўдвалася, бо ў малодшых класах карміла пасля першага ўрока. А потым школьныя сняданкі перанесліся на 12 гадзін. А ва ўніверсітэце і ўвогуле прымусу не стала. Таму прыйшлося перавучваць свой арганізм.

А вось есці перад тэлевізарам — не лепшы варыянт. І не толькі таму, што захапіўшыся фільмам, можаце не разлічыць памер порцыі. Аказваецца, у такой абстаноўцы ежа страчвае смак — адсюль і жаданне перайсці на чыпсы і іншы фаст-фуд, шкодра прыпраўлены харчовымі дабаўкамі.

Калі не ведаеце, чым заняць сябе, напрыклад, падчас прагляду тэлеперадачы, — вось вам парада. Рабіце практыкаванні для рук. І з канапы ўставаць не трэба, і мышцы будуць у тонусе.

Каб паскорыць абмен рэчываў, можна мяняць прадукты ў рацыёне. Адзін дзень аддаваць перавагу бялкам (выбіраць курыцу, тварог, рыбу), іншы — гародніне ці садавіне. Дазваляецца нават салодкі дзень, з булачкамі і шакаладам (у межах разумнага, вядома).

А галоўнае — не адкладайце свае пачынанні, датычныя здаровага ладу жыцця, да панядзелка. Спецыялісты даказалі, што гэта не самы лепшы дзень. Наадварот — менавіта ў панядзелак «зрываецца» большасць з тых, хто сядзіць на дыетах (а яшчэ частка, відаць, не вытрымлівае ў чаканні стрэсу на рабоце і здаецца ў нядзелю). Дык чаму б не знайсці час для карысных звычак ужо сёння?

*Крэатыўная змена*

## «Зубраня» прымае самых таленавітых

**У Нацыянальным адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня» завяршаецца рэспубліканская профільная змена «Заўсёды гатовы!» для лідараў Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыі.**

На працягу 18 дзён 205 самых актыўных, ініцыятыўных, крэатыўных, таленавітых і спартыўных піянераў з усіх рэгіёнаў краіны праходзілі ў «Зубраняці» навучанне і аздараўленне.

Упершыню візітнай карткай змены сталі дзве яркія падзеі — конкурсы «Піянер змены» і «Найлепшы Савет піянерскай арганізацыі». Удзельнікі прадставілі партфоліа, дэманстравалі тэарэтычныя веды і практычныя навыкі. Камандны дух, яднанне хлопцаў і дзяўчат былі патрэбнымі, каб адстаяць гонар свайго абласнога ці Мінскага гарадскога Савета піянерскай арганізацыі.

Праграма тэматычнай змены ўключала конкурс піянерскіх агітбрыгад «Запалі вогнішча дабра!», турнір эрудытаў «Розуму палата», конкурс піянерскіх каманд падтрымкі «Піянерскія іскры», конкурс газет «Піянерская праўда», postcard-акцыю «Іскры піянерскай дружбы», конкурсы «Піянерскі вернісаж» , «Гісторыя гальштука маёй сям'і», «Жывы летапіс Піянерыі», конкурс фотабёрдзінга «Птушыныя сябры», буктрэйлераў «Па старонках піянерскіх кніг», сацыяльнай рэкламы «Шчаслівая сям'я».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

*Ведай нашых!*

# У РЫТМЕ ХІП-ХОПА

## Як стаць найлепшым танцорам?

**Лічыцца, што каб навучыцца прафесійна танцаваць у гэтым стылі, трэба абавязкова ехаць на майстар-класы ў Амерыку. А між іншым, найлепшы выканаўца хіп-хопа жыве... у Мінску. На чэмпіянаце свету, які праходзіў восенню ў Аўстрыі, «золата» ў сольных выступленнях сярод юніёраў заваявала 15-гадовая Сафія ГАГІНА, вучаніца 10 класа сталічнай школы №61. У перапынку паміж урокамі і трэніроўкамі дзяўчына знайшла час, каб расказаць пра сваё захапленне і планы на будучыню.**



Займацца танцамі Сафія пачала ў трэцім класе.

— Падставай для гэтага стала мая гіперактыўнасць — звычайная справа для дзевяцігадовага дзіцяці, — расказвае школьніца. — Дагэтуль я каля трох гадоў хадзіла ў тэатральную студыю, так што танцы не былі маім першым творчым пачынаннем. Хіп-хоп не выбірала: што было блізка ад дома, туды мяне бацькі і аддалі.

Стыль дзяўчына асвойвала даволі лёгка. Яна добра адчувала музыку — а на першым этапе больш нічога і не патрабавалася.

За шэсць гадоў, што Сафія займаецца танцамі, яна паспела стаць абсалютнай чэмпіёнкай Беларусі па хіп-хопе, заваяваць «золата» ў дзвюх намінацыях у сёлетнім чэмпіянаце Еўропы па вулічных танцах. Дома на сцяне ў яе вісіць каля 40 медалёў! Але самы дарагі для дзяўчыны — менавіта апошні, атрыманы на сусветным чэмпіянаце.

Як мінскай школьніцы ўдалося дасягнуць такіх вынікаў? Сакрэтнай формулы поспеху ў Сафіі няма. Расказвае, што стараецца максімальна ўдзяляць увагу трэніроўкам. І хаця ў яе раскладзе значацца толькі два абавязковыя заняткі танцамі на тыдзень, яна дадаткова прыходзіць яшчэ разы тры. На канікулах, напрыклад, трэніруецца кожны дзень. Пра прыродны талент дзяўчына сціпла прамаўчала.

У адрозненне ад «бальнікаў», якім прыходзіцца аддаваць вялікія грошы на касцюмы, танцорам хіп-хопа сур'ёзна традыцыя на форму не трэба.

— Касцюмаў нават і няма. Танцуеш у тым, у чым зручна, — у шырокім адзенні, якое не абмяжоўвае рухаў, — тлумачыць дзяўчына. — Большасць выдаткаў на танцы звязаны з паездкамі.

Абмяжоўваць сябе ў салодкім, каб быць трысціначкай на сцэне, не патрабуюць. І хаця сама Сафія — вельмі зграбная дзяўчына, яна заўважае, што ў хіп-хопе фігура не мае значэння: «Гэта не гімнастыка. Вага нічога не вырашае».

— На школьных дыскатэках ты, напэўна, заўсёды ў цэнтры ўвагі? — пытаюся ў Сафіі. Аказваецца, не: на тыя дыскатэкі дзяўчына не ходзіць. Няма там чаго рабіць...

Цікаўлюся, як дзяўчына за пастаяннымі трэніроўкамі і паездкамі на конкурсы паспявае вучыцца. Яе сярэдні бал за папярэдні дзявяты клас — 9,5! Але Сафія ацэньвае сябе даволі крытычна. «Адзнакі ў школе — гэта нешта абстрактнае. У вучобе ў мяне насамрэч практычна заўсёды лёгкі «завал». Шмат дамашніх заданняў, нецікавых урокаў... Але я не паспяваю не праз маю занятасць, а праз няўменне правільна размяркоўваць час».

— Чытала, што ты марыш стаць хімікам...

— Тое інтэрв'ю давала не я, а мой тата. Нашы ўяўленні аб маёй будучыні крыху не супадаюць, так што гэта праўда толькі часткова, — усміхаецца Сафія.

Па словах чэмпіёнкі, у яе ёсць некалькі варыянтаў, куды паступаць пасля школы, у тым ліку яна разглядае і спецыяльнасці, звязаныя з хіміяй. Але, як і многія старшакласнікі, дзяўчына пакуль што з прафесіяй не вызначылася.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

И З В Е Щ Е Н И Е   О   П Р О В Е Д Е Н И И   А У К Ц И О Н А

## Управляющий в производстве по делу об экономической несостоятельности (банкротстве)

# ОАО «Агрокомбинат «Олехновичи»

## проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества:

**Лот №1 –** Имущество в составе:

| Недвижимое имущество | | | |
|---|---|---|---|
| № | Наименование | Инв. № | Общ. пл., кв.м |
| 1 | здание конторы (административное здание) | 630/С-60033 | 1557.7 |
| 2 | здание проходной №1 | 630/С-73099 | 56 |
| 3 | здание склада №3 | 630/С-73101 | 16.7 |
| 4 | здание дезбарьера | 630/С-73106 | 51.6 |
| 5 | здание весовой | 630/С-73100 | 133.2 |
| 6 | здание спец. автомобильного транспорта | 630/С-64351 | 736.6 |
| 7 | здание диспетчерской | 630/С-73110 | 22.7 |
| 8 | здание склада | 630/С-73105 | 71.8 |
| 9 | здание проходной №2 | 630/С-73140 | 6.3 |
| 10 | здание склада | 630/С-73103 | 1136.9 |
| 11 | здание склада | 630/С-73102 | 22.3 |
| 12 | мастерские механические | 630/С-64360 | 788.1 |
| 13 | здание колбасного цеха | 630/С-60036 | 902.1 |
| 14 | консервный цех | 630/С-64361 | 257.1 |
| 15 | здание котельной | 630/С-60028 | 890.7 |
| 16 | убойный цех | 630/С-64347 | 2137.9 |
| 17 | здание лаборатории | 630/С-73223 | 286.2 |
| 18 | здание скотобойной площадки | 630/С-73224 | 283 |
| 19 | здание склада для хранения тары | 630/С-73227 | 579 |
| 20 | здание склада | 630/С-73228 | 65 |
| 21 | здание склада | 630/С-73230 | 65.6 |
| 22 | здание склада | 630/С-73231 | 65 |
| 23 | здание склада | 630/С-73435 | 63.9 |
| 24 | здание склада | 630/С-73232 | 64.4 |
| 25 | здание склада | 630/С-73233 | 64.7 |
| 26 | здание ветблока | 630/С-73225 | 503.7 |
| 27 | склад для хранения комбикорма | 630/С-64346 | 865.3 |
| 28 | здание инкубационного цеха | 630/С-73107 | 1002.3 |
| 29 | здание специализированное животноводства | 630/С-64359 | 1363.4 |
| 30 | здание маточника птичника №2 | 630/С-73408 | 1364 |
| 31 | здание маточника птичника №5 | 630/С-73410 | 1386.4 |
| 32 | здание маточника птичника №4 | 630/С-73409 | 906.3 |
| 33 | здание маточника птичника №6 | 630/С-73411 | 1359.8 |
| 34 | здание маточника птичника №7 | 630/С-73412 | 1375.9 |
| 35 | здание птичника №17(2) | 630/С-42687 | 1093 |
| 36 | здание птичника №8 | 630/С-47495 | 1372.4 |
| 37 | здание птичника №24 | 630/С-60035 | 1440.2 |
| 38 | здание птичника №23 | 630/С-73407 | 1390.6 |
| 39 | здание птичника №22 | 630/С-73406 | 1382.1 |
| 40 | здание птичника №21 | 630/С-73405 | 1387.2 |
| 41 | здание птичника №20 | 630/С-73404 | 1392.1 |
| 42 | здание птичника №19 | 630/С-73403 | 1391.4 |
| 43 | здание птичник №18 | 630/С-73401 | 1390.8 |
| 44 | здание батарейного цеха №1 | 630/С-47499 | 1802.8 |
| 45 | здание батарейного цеха №2 | 630/С-47492 | 1804.4 |
| 46 | здание батарейного цеха №3 | 630/С-47502 | 1793.3 |
| 47 | здание птичника №17(1) | 630/С-42686 | 1096.7 |
| 48 | здание птичника №16 | 630/С-42685 | 1099.9 |
| 49 | здание птичника №15 | 630/С-42683 | 1097.2 |
| 50 | здание птичника №14 | 630/С-73400 | 1383.7 |
| 51 | птичник №13 | 630/С-64355 | 1385.2 |
| 52 | птичник №12 | 630/С-60032 | 1391.7 |
| 53 | птичник №11 | 630/С-64350 | 1378.5 |
| 54 | здание птичника №10 | 630/С-60031 | 1431.8 |
| 55 | птичник №9 | 630/С-64349 | 1421.1 |
| 56 | здание батарейного цеха №4 | 630/С-64356 | 1799.4 |
| 57 | батарейный цех №5/1,2 | 630/С-64352 | 1816.2 |
| 58 | здание батарейного цеха №6/1,2 | 630/С-64354 | 1816.2 |
| 59 | здание конюшни | 630/С-73413 | 294.7 |

| Сооружения | | | |
|---|---|---|---|
| | Наименование | Инв. № | Протяженность/ общ. пл. |
| 60 | линия освещения | 630/С-73970 | 1778,9 м |
| 61 | сети электрические | 630/С-73972 | 6946,5 м |
| 62 | сети водоснабжения | 630/С-73973 | 5041,8 м |
| 63 | автомобильные дороги внутреннего и наружного использования | 630/С-73975 | 59453,7 кв.м |
| 64 | ливневая канализация | 630/С-74625 | 3249,8 м |
| 65 | сети газоснабжения и газораспределения | - | 7783,41 м |
| | Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 623800000001000019, общей площадью 88,9042 га (предоставлен на праве постоянного пользования) по адресу: Минская область, Молодечненский район, Олехновичский с/с, 43. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: земли, находящиеся в охранных зонах магистральных трубопроводов, систем газоснабжения, код-7, площадь – 0,24 га; земли, находящиеся в прибрежных полосах водных объектов, код-1, площадь – 6,93 га; земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи, код-6, площадь – 4,98 га | | |
| 66 | пометохранилище | 630/С-73924 | 4466,0 кв. м |
| | Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 623800000001000018, общей площадью 58,6567 га (предоставлен на праве постоянного пользования) по адресу: Минская область, Молодечненский район. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи, код-6, площадь – 0,58 га; земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи, код-6, площадь – 0,68 га | | |

| Транспортная техника | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 67 | Наименование/ рег. № | Кузов № | Год выпуска | Тип | Цвет ТС |
| 68 | Audi A6 2332 ВА-5 | WAUZZZ4AZSN027277 | 1994 | Легковой специальный седан | Бордовый |
| 69 | GAZ-3309 АЕ 0778-5 | 33070070140601 33090070948602 | 2007 | Грузовой фургон | Белый |
| 70 | GAZ-3309 АВ 3016-5 | 60040625 33090070921925 | 2006 | Грузовой фургон изотермический | Белый |
| 71 | ZIL-131 AI 2339-5 | 430945 | 1981 | Грузовой фургон (авторазливочная станция АРС) | Темно-зеленый |
| 72 | ZIL-130 ОМ 1392 | 3149143 | 1981 | Грузовой специальный бункер | Синий |
| 73 | МАЗ 555147 1844 АК-5 | Y3M5551479000031 | 2010 | Грузовой самосвал | Белый |
| 74 | PAZ 3205 АЕ 6449-5 | XTM32050096002461 96002461 | 1996 | Автобус вагон | Бело-голубой |
| 75 | MAZ 857100 4022 А 8383А-5 | Y3M857100A0006704 | 2010 | Прицеп специальный самосвал | Серый |
| 76 | ПСТ-12 ОВ-5 8054 | 462 | 2010 | Полуприцеп | Зеленый |
| 77 | ЗСКП-8 | - | 2000 | Загрузчик сухих кормов прицепной | Зеленый |
| 78 | ПТУ 4-1 | - | - | Полуприцеп тракторный универсальный | Зеленый |
| 79 | МТЗ-952 ОА 4417 | 09002021 | 2000 | Трактор | Синий |
| 80 | Беларус-1221 В ОА-5 9436 | 12019586 | 2007 | Трактор (фронтальный погрузчик) | Синий |
| 81 | МТЗ-82.1 ОА 2459 | 457409 | 1998 | Трактор | Красный |
| 82 | оборудование согласно перечню (перечень находится у организатора аукциона) | | | | |
| 83 | малоценные быстро снашивающиеся предметы согласно перечню (перечень находится у организатора аукциона) | | | | |

Вышеуказанное имущество предназначено для производства мяса птицы и ведения товарного сельского хозяйства.

**Начальная цена с учетом НДС (20%) –** 3 097 273 рубля 76 копеек.

**Задаток в размере 5 (пять) % от начальной цены (154 863 рубля 69 копеек) перечисляется на р/с № 3012054410511 в ЗАО «МТБанк», БИК 153001117, г. Минск, УНП 600077897 ОАО «Агрокомбинат «Олехновичи».**

**Сумма шага аукциона (5%) – 154 863 рубля 69 копеек.**

**Аукцион состоится 20.12.2016 г. в 13.00 по адресу: Минская область, Молодечненский район, а/г Олехновичи, ОАО «Агрокомбинат «Олехновичи», ул. Радошковичская, 43, актовый зал.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.12.2016 г.** до 16.00 по адресу: Минская область, Молодечненский район, а/г Олехновичи, ул. Радошковичская, 43, ОАО «Агрокомбинат «Олехновичи», приемная.

Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:

- заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении о проведении торгов;

- для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя (без нотариального засвидетельствования);

- для юридического лица – доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования);

- для иностранного юридического лица, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования);

- для представителя гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) рабочих дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.

Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником, предмет торгов продается этому единственному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) возмещает затраты, связанные с организацией и проведением торгов.

Ознакомиться с предметом торгов и документами, необходимыми для проведении торгов, можно в дни приема заявлений на участие в торгах с 8.00 до 17.00 по адресу: Минская область, Молодечненский район, а/г Олехновичи, ул. Радошковичская, 43, ОАО «Агрокомбинат «Олехновичи» у организатора торгов.

С дополнительной информацией об объекте торгов можно ознакомиться по адресу: Минская область, Молодечненский район, а/г Олехновичи, ул. Радошковичская, 43, ОАО «Агрокомбинат «Олехновичи», тел.: (80176) 79-12-84, +375 44 555 04 43

# ОБЪЯВЛЕНИЕО ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | **Лот №1. Рассеиватель минеральных удобрений дисковый РДУ-3,0 в количестве одной единицы, новый, начальная стоимость лота – 9269,01 белорусских рублей** |
| Собственник (владелец) имущества | Открытое акционерное общество «Технолит Полоцк» |
| Местонахождение имущества | г. Полоцк, ул. Ленинградская, 101. По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к Табачниковой Светлане Александровне, тел. 8 (029) 712-75-13 |
| Наличие обременений | Залог ОАО «БПС-Сбербанк» |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.4 19 декабря 2016 года в 11.00 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210029, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1 Судебный исполнитель Атрахимович Николай Александрович, тел. (0212) 61 40 24 Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 61 40 15 |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 филиала № 200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 **не позднее 15.00 16 декабря 2016 года.** Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** | | |
| **Продавец** | **Унитарное предприятие «Слуцкий рынок ОПС», г. Слуцк, пл. Базарная, 13** | | |
| **Предмет аукциона** (одним лотом) | | | |
| Наименование | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес (номер дома) |
| **Месторасположение предмета аукциона:** Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Максима Богдановича | | | |
| **Здание кирпичное** | 40,4 кв.м | 640/С-84557 | д. 136А/1 |
| **Здание склада** | 286 кв.м | 640/С-84559 | д. 136А/2 |
| **Сведения о земельном участке**: пл. 0,1009 га, предоставлен продавцу на праве аренды сроком по 10.01.2033 г. для содержания и обслуживания зданий. Ограничения прав: водоохранная зона реки Случь, площадь 0,1009 га | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 36 940 руб. 00 коп. (369 400 000 бел. руб.)** | | | |
| **Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYR) перечисляется на р/с № 3012343260010; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by** | | | |
| Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 30.07.2016 | | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **13.12.2016 г. в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | |
| **Дата и время окончания приема документов** | **12.12.2016 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by** | | |

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАНАМ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНЫХ ЖИЛЫХ ДОМОВ в г. Кобрине Брестской области 16 декабря 2016 года в 11.00

| № лота | Адрес земельного участка | Целевое назначение земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь земельного участка, га | Наличие инженерной и транспортной инфраструктуры | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. | Затраты на организацию и проведение аукциона, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | г. Кобрин, ул. Чапаева, 2 | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 124350100001007645 | 0,1018 | Наличие сетей газоснабжения, электроснабжения и водоснабжения в 50 м | 22 604,10 | 2260,41 | 1216,02* |
| 2. | г. Кобрин, ул. Чапаева, 6 | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 124350100001007647 | 0,1019 | Наличие сетей газоснабжения, электроснабжения и водоснабжения в 50 м | 22 626,30 | 2262,63 | 1214,87* |
| 3. | г. Кобрин, ул. Чапаева, 8 | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 124350100001007648 | 0,1019 | Наличие сетей газоснабжения, электроснабжения и водоснабжения в 50 м | 22 626,30 | 2262,63 | 1214,87* |
| 4. | г. Кобрин, ул. Интернациональная, 105 | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 124350100001007650 | 0,1026 | Наличие сетей газоснабжения, электроснабжения и водоснабжения в 50 м | 22 782 | 2278,20 | 1199,18* |
| 5. | г. Кобрин, ул. Чапаева,10 | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 124350100001007649 | 0,1134 | Наличие сетей газоснабжения, электроснабжения и водоснабжения в 50 м | 25 179,80 | 2517,98 | 1180,82* |
| 6. | г. Кобрин, пер. Солдатский, 38 | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 12435010000107113 | 0,1040 | Сети водоснабжения и электроснабжения проходят по переулку | 9990 | 999 | 797,20* |
| 7. | г. Кобрин, пер. Солдатский, 32 | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 124350100001007082 | 0,1010 | Сети водоснабжения и электроснабжения проходят по переулку | 9950 | 995 | 797,20* |
| 8. | г. Кобрин, пер. Солдатский, 40 | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 124350100001007079 | 0,1081 | Сети водоснабжения и электроснабжения проходят по переулку | 10 030 | 1003 | 797,20* |

** расходы на публикацию извещения в СМИ.*

**Организатор аукциона – Кобринский районный исполнительный комитет.**

**Аукцион состоится 16 декабря 2016 года в 11.00 по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, зал заседаний, 1-й этаж.**

Заявления на участие в аукционных торгах с необходимыми документами принимаются по адресу: **г. Кобрин, ул. Суворова, 25, райисполком, каб. 403 с 8.00 до 13.00 по рабочим дням.**

**Последний день приема заявлений – 12 декабря 2016 г. до 13.00.**

**Тел. для справок: 8(01642) 2-28-11, 2-32-82.**

Продажа земельных участков осуществляется гражданам Республики Беларусь.

К участию в аукционе допускаются граждане, подавшие заявления в установленный в извещении срок, предоставившие документ о внесении суммы задатка (задатков) и заключившие с Кобринским райисполкомом соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Более подробная информация об условиях проведения аукциона размещена на сайте **www.brest-region.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА в г. Кобрине Брестской области 16 декабря 2016 года в 11.30

| № лота | Адрес земельного участка | Целевое назначение земельного участка | Срок аренды земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Наличие инженерной и транспортной инфраструктуры | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. | Затраты на организацию и проведение аукциона, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | г. Кобрин, ул. Мира, 17 | Строительство и обслуживание жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 99 лет | 124350100001007115 | 0,1431 | Сети газоснабжения, водоснабжения, электроснабжения и канализации проходят по улице | 25 071,10 | 2507,11 | 857,57* |

**ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА – КОБРИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ.**

**Аукцион состоится 16 декабря 2016 года в 11.30 по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, зал заседаний, 1-й этаж.**

Заявления на участие в аукционных торгах с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, райисполком, каб. 403 с 8.00 до 13.00 по рабочим дням.

**Последний день приема заявлений – 12 декабря 2016 г. до 13.00.**

**Тел. для справок: 8(01642) 2-28-11, 2-32-82.**

Продажа земельного участка осуществляется гражданам Республики Беларусь и иностранным гражданам.

К участию в аукционе допускаются граждане, подавшие заявления в установленный в извещении срок, предоставившие документ о внесении суммы задатка (задатков) и заключившие с Кобринским райисполкомом соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Более подробная информация об условиях проведения аукциона размещена на сайте **www.brest-region.by**

*Ужыцца ў ролю*

# СА СЦЭНЫ — У КІНО,

## або Голас для дзяўчыны з трапічных астравоў



**Хто сачыў за адборам на дзіцячае «Еўрабачанне» апошнія два гады, успомніць яркі, эмацыянальны голас Зіны КУПРЫЯНОВІЧ. Дзяўчына двойчы была сярод фіналістаў нацыянальнага конкурсу, а яе песня «Мір» стала гімнам «Гонкі легенд» з Дар'яй Домрачавай. Сёлета маладую спявачку таксама пачуюць многія, прычым не толькі са сцэны. У снежні кінатэатры Беларусі пакажуць анімацыйны фільм «Маана» студыі Уолта Дыснея. У рускім дубляжы голас Зіны атрымала галоўная гераіня незвычайнай гісторыі — смелая і вынаходлівая дачка правадыра на адным з астравоў Ціхага акіяна.**

Сустрэць Зіну ў дзіцячым прадзюсарскім цэнтры «Super Puper» можна нават у выхадныя — дзяўчына займаецца сама і развучвае танцы з малодшымі дзецьмі.

***— Як даўно ты пачала танцаваць?***

— Прыблізна год таму. А з верасня пачала вучыць гэтаму іншых. Цяпер я ражысёр-пастаноўшчык кліпа, рыхтую танцавальную частку да здымак, і гэта займае ледзь не ўвесь час. Мне падабаецца вучыць: гэта весела, цікава, часам цяжка, але ў выніку ўсё добра заканчваецца і бачны плён ад працы.

***— Да 14 гадоў ты паспела паўдзельнічаць больш чым у трох сотнях канцэртаў. Якія планы на будучыню?***

— Пакуль што атрымліваю запрашэнні на канцэрты, якія адбываюцца ледзь не кожны тыдзень і з рознай нагоды. Але вялікіх пакуль не плануецца. Калі ж гаварыць пра тыя мерапрыемствы, дзе мару пабываць, то хацелася б трапіць на дарослую «Новую хвалю», бо я ўжо лаўрэат дзіцячай часткі гэтага конкурсу. Яшчэ будзе цікава зноў паспрабаваць сілы ў конкурсе «Голас», але таксама ў дарослым складзе.

***— Ёсць любімая песня з выступленняў?***

— Ёсць некалькі аўтарскіх песень, у стварэнні якіх я ўдзельнічала. З аўтарам Валерыем Шматам мы супрацоўнічаем чатыры гады, і ён напісаў самыя вядомыя кампазіцыі: «Космас», «Мір», «Чыстая сляза». Тады мы адпрацоўвалі з ім кожны нюанс, я магла папрасіць замену для нейкага слова, ці паглыбіць біты, ці перарабіць нейкі пераход... Песні, якія ствараюцца на тваіх вачах, спяваць куды прыемней.

***— Акрамя сольных нумароў, табе даводзілася выступаць на сцэне са знакамітымі артыстамі. Якое сумеснае выступленне найбольш паўплывала на цябе?***

— Выступала разам з Юліянай Каравулавай, Дзянісам Клявeрам, IOWA, Дамінікам Джокерам... Вельмі класна аказалася быць побач на сцэне з IOWA. Гэта было маё першае выступленне з «зоркай», і я атрымала многа адрэналіну, адчувала, што эмоцыі літаральна гатовыя выбухнуць, скакала, падала... Мне тады артыст упершыню распісаўся на куртцы.

***— Ці ёсць славутасць, на якую ты раўняешся?***

— Хачу быць сабой і не паўтараць кагосьці. А сваім ідэалам у жыцці магу назваць спявачку Бейонсэ, бо яна цікавы чалавек, цудоўная выканаўца і артыстка, добрая жонка і маці.

**«У час запісу я старалася паўтараць усе яе рухі і міміку, каб было лягчэй адчуць тое, што адбываецца ў сцэне, і каб гук атрымліваўся такі, як трэба».**

***— Якой бачыш сябе на сцэне праз некалькі гадоў?***

— Пакуль не ведаю, бо жыву сённяшнім днём. Думаю, сапраўдны артыст дорыць мноства пазітыўных эмоцый гледачам і слухачам. У мяне ёсць фанаты, я стасуюся з імі. Яны заўсёды вясёлыя, пазітыўныя, адчуваеш, што аддаюць табе такі ж паток яркіх, крутых эмоцый, якія ты перадаеш ім. Пасля сустрэч падымаецца настрой.

***— У дзяцінстве табе прарочылі будучыню мастачкі і балерыны. Ці засталіся гэтыя захапленні цяпер?***

— Час ад часу малюю, калі душа патрабуе. А вось балет і гімнастыка засталіся ў мінулым, хапае танцаў, скейтборда, шпацыраў па парку.

***— Упершыню персанажа сусветнавядомай анімацыйнай студыі агучвае артыст з Беларусі. Дзяўчына Маана няўрымслівая і шматбаковая. З ёй давялося і плакаць, і радавацца, і адстойваць сваё меркаванне. Калі ўлічыць, што гэта твой першы вопыт агучвання, ці былі нейкія прыёмы, што дапамагалі ўжыцца ў ролю?***

— Маана — вельмі цікавая дзяўчына. З ёй здараюцца розныя прыгоды, але ўвесь час стараецца не паглыбляць канфлікты, яна не бянтэжыцца, а штораз рухаецца далей. У час запісу я старалася паўтараць усе яе рухі і міміку, каб было лягчэй адчуць тое, што адбываецца ў сцэне, і каб гук атрымліваўся такі, як трэба. Мы разам бегалі, смяяліся, танулі, спявалі...

***— Анімацыйны фільм агучвалі і дарослыя знакамітасці: Ілья Лагуценка, Юліяна Каравулава, Дзяніс Клявер і Грыгорый Сіяцвінда... Ці дапамагалі старэйшыя калегі парадамі?***

— Артысты запісваюцца кожны асобна, нават у дыялогах. Потым фразы выразаюцца і манціруюцца. Так што з іншымі я магла сустрэцца толькі мелькам, напрыклад, разам выпіць кавы. За запісам сачылі адразу два рэжысёры, бо Маана ў сваім падарожжы не толькі гаворыць, але і спявае. Часам было складана, але мне падказвалі, што рабіць, і я выконвала патрабаванні, бо ведала: побач знаходзяцца прафесіяналы.

***— Ці ёсць у цябе вольная гадзіна, каб паглядзець мультфільмы, а не толькі агучваць іх?***

— Часу мала, таму аддаю перавагу кінатэатрам, каб ужо дакладна адчуць карціну з вялікага экрана. На «Маану» пайду абавязкова. Спачатку паедзем на прэм'еру ў Маскву, потым вернемся, каб сустрэць першыя дні паказу ў Мінску. Мы мяркуем, што гэта стане добрай нагодай, каб арганізаваць інтэрактыўную пляцоўку і фотазону для сустрэчы з паклоннікамі.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.** *yurgel@zviazda.by*

*Камертон настрою*

# ШЭПТАМ ПРА СУСВЕТ

## Беларускія музыкі запішуць новы альбом на «чыстай энергіі»

**«Размову» вядуць перкусія, бас-гітара і акардэон... Слухачы, якія змаглі патрапіць у агульны з гэтай музыкай настрой, кажуць, што тая здольная гіпнатызаваць, як спевы шаманаў альбо полымя вогнішча.**
**Некалькі гадоў таму музыкі Аляксей ВАРСОБА, Сяргей КРАЎЧАНКА і Аляксей ВАНЧУК ужо спрабавалі запісваць кампазіцыі ў «натуральным» асяродку, для чаго вывезлі абсталяванне музычнай студыі ў лес пад Мінскам. Так альбом «Thou» набыў незвычайнае гучанне і перамог у галоўнай намінацыі «Альбом года» на сайце Experty.by, дзе ўлічваліся водгукі музычных крытыкаў з Беларусі і замежжа. Свой новы альбом удзельнікі гурта Port Mone вырашылі запісваць на «зялёнай» энергіі. Замест студыі — парк з сонечнымі панэлямі ці вольны прастор ветрапарку.**
**Як акампанемент — гудзенне ветракоў і галасы птушак.**



**Сяргей КРАЎЧАНКА, перкусіяніст:** З ідэяй запісу альбома на ўзнаўляльнай энергіі мы спачатку пайшлі па камерцыйных арганізацыях, але не адчулі падтрымкі. Нам прапанавалі цалкам лагічнае выйсце: калі гэта праект аб экалогіі ў самым шырокім сэнсе слова, то і аб'ядноўвацца трэба з тымі, хто працуе ў гэтым кірунку. Так мы выйшлі на таварыства «Зялёная сетка». Праект стаў адным з пераможцаў экалагічнага конкурсу «Зялёнка», так што частка сродкаў на яго ажыццяўленне ўжо ёсць. Мяркуем, што астатнюю суму нам дапаможа сабраць запушчаная на платформе Talaka.by краўдфандынг-кампанія.

Падаецца, у Беларусі не самыя спрыяльныя ўмовы для ўзнаўляльнай энергетыкі: цяжка знайсці мясціны, дзе б дзьмулі пастаянныя моцныя вятры, ды і сонца ледзь не паўгода хаваецца за хмарамі, аднак музыканты абвяргаюць гэтыя міфы.

**Аляксей ВАНЧУК, бас-гітара:** Насамрэч, магчымасць выкарыстання энергіі ветру ў нашай краіне — вельмі перспектыўны кірунак. Сонечным батарэям таксама не патрэбна толькі яснае надвор'е. Напрыклад, у Скандынаўскіх краінах, дзе ўзнаўляльная энергетыка ў пашане, сонца яшчэ меней, а вятры дзьмуць прыкладна як і ў нас.

**«Не так проста вывезці тэхніку, арганізаваць запіс у «натуральных» умовах, але мы робім гэта ўжо не ўпершыню».**

**Сяргей:** Мы, калі шукалі матэрыялы для ідэі альбома, дазналіся пра многае. Я, напрыклад, «нагугліў» ветракі пад Навагрудкам ледзь не ў сто метраў вышынёй. Але справа не толькі ў недасведчанасці. Смецце, кінутае на вуліцы, дым, што ідзе з трубы завода, насамрэч куды мацней звязаны з нашым светаўспрыманнем, чым можа падацца напачатку.

Музыкі не бяруцца павучаць. Іх мэта іншая: расказаць пра праблемы не толькі прыродныя, але і агульначалавечыя, закрануць «экалогію душы». Рабочая назва будучага альбома «Whisper». Сяргей Краўчанка тлумачыць, чаму размову пра важнае музыканты будуць весці «шэптам»:

— Каб пачуць ціха сказаныя словы, трэба прыслухоўвацца. Спрабаваць нешта змяняць разам, размаўляючы ціха, амаль шэптам, значна прасцей, чым калі вакол грукат, усе крычаць, ты крычыш, і перамены атрымліваюцца такімі ж няўстойлівымі, як і асяроддзе, якое іх нарадзіла. Чым легкадумней ставішся да інфармацыі, якая пранікае ў цябе, тым мацней верагоднасць, што большая частка з накопленага будзе баластам, смеццем. А смецце ў думках нараджае канфлікты.

Каб адшукаць будучыя пляцоўкі для запісу, гурт сёлета выправіўся ў падарожжа па краіне. Музыкі шукалі мясціны, дзе выпрацоўваецца ўзнаўляльная энергія, сустракаліся з аматарамі-вынаходнікамі, якія «прыручылі» вецер.

**Сяргей:** У вандроўцы мы не засяроджваліся на тым, колькі кілават выпрацоўвае ветрак. Цікавіла месца, яго атмасфера, ну і, вядома, візуальныя і аўдыяльныя паказчыкі. Нядаўна прыгадваў, якія гукі мне падабаюцца, і ўсвядоміў, што яны звязаныя з дзяцінствам. Люблю гук аўтастрады, калі ты ідзеш па лесе, а дарога знаходзіцца за тры кіламетры ад цябе. Памятаю, як шумяць трубы, калі ты ныраеш у ванну з галавой. Яшчэ падабаецца, як човен слізгае па лістах гарлачыкаў. Цяпер я слухаў, як працуюць ветрагенератары, і гэта таксама чароўна. Гук падобны на ўзмах рукі велікана, гэткае веліканскае кунг-фу.

Стваральнікі парку каля Нарачы пайшлі выканаўцам насустрач і пагадзіліся змайстраваць спецыяльную «разетку», каб можна было падключыць абсталяванне да сонечных батарэй.

**Аляксей:** Акрамя атмасферы, паміж адкрытай прасторай і студыяй ёсць адрозненні чыста тэхнічныя. Акустычныя ўласцівасці незамкнёнай прасторы вырашаюць, якім атрымаецца гучанне інструментаў падчас запісу. Музыка на прыродзе вучыць цябе гнуткасці і «ўключанасці». Мы не супраць студыі, але нам цікавей эксперыментаваць. Канешне, не так проста вывезці тэхніку, арганізаваць запіс у «натуральных» умовах, але мы робім гэта ўжо не ўпершыню.

**«Я слухаў, як працуюць ветрагенератары, і гэта таксама чароўна. Гук падобны на ўзмах рукі велікана, гэткае веліканскае кунг-фу».**

Пра пераадоленне цяжкасцяў раскажа дакументальны фільм. Украінец Вадзім Ількоў з гуртам Port Mone знаёмы ўжо шэсць гадоў. Калі музыкам прыйшла думка зняць яшчэ і фільм, то з кандыдатурай рэжысёра доўга не вагаліся.

**Сяргей:** Падаецца, што яго падыход да здымак у нечым падобны на наш да музыкі: прысутнічае элемент імправізацыі.

Паміж фільмам і музычным альбомам, безумоўна, будзе сувязь, але відэа ні ў якім разе не стане звычайным кліпам. Мяркуецца, што відэаматэрыял потым будзе ўдзельнічаць у розных кінаконкурсах.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.** *yurgel@zviazda.by*

SEX-БАЛЯСЫ

# НЮансы НАШАГА ЧАСУ

**Нядаўна з'явілася паведамленне, што галівудскія «зоркі» зрабілі масавае сэлфі без макіяжу. Амерыканская актрыса Дру Бэрымор выклала ў сваім інстаграме здымак з каляжанкамі па «цэху» з вяршыні гары ў Мексіцы. Што ў гэтым такога, спытаеце вы? Па сутнасці, быццам бы нічога, прынамсі, з мужчынскага пункту гледжання. Нам чаго хваляваецца? («Жаночая прыкмета: выйшла з дому без макіяжу — сустрэнеш усіх знаёмых!») Праўда, крыху здзівілі каментарыі пад тым здымкам. Маўляў, без касметыкі названыя вышэй «зоркі» — самыя звычайныя па знешнасці людзі.**

Пагаджуся з гэтым відавочным выказваннем. («Ты можаш быць лэдзі самых вытанчаных музычных густаў, але ўсё роўна на карпаратыве станцуеш пад «Ленінград», пракрычаўшы ўсе словы на памяць».) Але трэба ўлічваць, што «зоркі» — людзі публічныя, да таго ж жанчыны.

Паўстаць перад староннімі без макіяжу для іх — гэта як прылюдна агаліцца. Прычым, мабыць, нават у большай ступені, чым як бы зрабіўшы тое фізічна, напрыклад, паводле ролі. Бо заўсёды можна спаслацца на задуму рэжысёра, нават калі сам пахуліганіць не супраць. («Адзін раз на тыдзень — проста будзьце сабой! У астатнія шэсць — аднаўляйце рэпутацыю».) Ну, дык тое ў кіно. А ў жыцці яшчэ круцейшы «галівуд» бывае, калі агаляюцца, як той казаў, направа і налева...

**Сама 21-гадовая мадэль ухілілася ад каментарыяў прэсе. Фатограф жа быў у захапленні ад піяру...**

Нядаўна на слыху была гісторыя пра пікантныя фатаграфіі ў сеціве намесніка міністра ўнутраных спраў Украіны па еўраінтэграцыі. Па-першае, на хвіліначку, гэтай асобе... 24 гады. Пагадзіцеся, кар'ерны рост, варты слынных вайскоўцаў падчас вайны. («Ты ў цуд верыш? — Не. — А дарэмна. У сябе трэба верыць».) Па-другое, дзяўчына ў анкеце пазначыла, што мае дзесяцігадовы стаж работы. Як вам? («Ну навошта ты гэта зрабіў? — Я быў малады! — Гэта было два дні таму! — Ммм, якія былі часы...») На абарону сваёй падначаленай стаў міністр унутраных спраў. «24-гадовы ці 30-гадовы выйграе ў вопытнага 50-гадовага. Гэта нармальна і гэта праца». Ну, сапраўды, — «у цябе выдатны характар, проста ў людзей нейкая слабая псіхіка»... Але ж мы пра іншае, пра тыя самыя пікантныя здымкі наваспечанага намесніка міністра ўнутраных спраў. Як прыватная асоба дзяўчына вольная рабіць што хоча, хаця і ў гэтым выпадку з галавой трэба сябраваць. Ці да твару такія паводзіны дзяржслужачай? («Раней я непакоілася, што мяне могуць кінуць і забыць. Цяпер баюся, што мяне могуць запомніць і знайсці».) Хіба толькі загадка прызначэння крыецца ў слове «еўраінтэграцыя»?

Гісторыя з агаленнем практычна ў той жа час мела месца і ў нашай краіне. Вось ужо сапраўды, як у тым анекдоце. «Толькі ў нас «пятая кропка» — не частка цела, а падзея! А поўная... — увогуле комплекс мерапрыемстваў!» Сталічная міліцыя пыталася ў карыстальнікаў сеціва, што рабіць з дзяўчынай, якая ў ніжняй бялізне сфатаграфавалася ў пікантнай позе на... плошчы Перамогі ў Мінску? Сама 21-гадовая мадэль ухілілася ад каментарыяў прэсе. Фатограф жа быў у захапленні ад піяру... Хацелася б сказаць нешта кшталту «не такая страшная бяда», але ж... Дзяўчына, прыгожая і таленавітая, ледзьве не пераступіла мяжу, якую пераступаць нельга. На месцы нашых праваахоўнікаў я б проста пагаварыў з ёй шчыра. («Маё дзяцінства прайшло без інтэрнэту. Можа, таму я разумею, што за языком трэба сачыць, а за словы — адказваць».)



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

...Агаленне бывае не толькі фізічным. І калі за апошнім стаіць мэта паказаць найперш маладое цела, дык пры агаленні душы часам можа не дапамагчы нават прыгожая «вокладка» — выскачыць уся паднаготная. 19-гадовая дачка расійскага тэнісіста Кафельнікава выказалася ў сеціве адносна свайго палёту не на асабістым самалёце, а на звычайным рэйсавым: маўляў, захацела пабыць у адным салоне разам з «нікчэмнымі людзьмі»... Неўзабаве ў інтэрнэце з'явіліся... эратычныя фатаграфіі аўтара выказвання — магчыма, каб неяк (як бачылася маладой дзяўчыне) згладзіць наступствы сказанага раней.

А як вам нядаўняя гісторыя пра прадпрымальнага жыхара Магілёва, які падазраецца ў шантажы палюбоўніка жонкі? 36-гадовы мужчына, даведаўшыся пра здраду другой палавінкі, зарэгістраваўся пад прыдуманым імем у сацыяльных сетках, каб весці перапіску з тым самым палюбоўнікам з мэтай... атрымання грошай за маўчанне пра яго сувязь з замужняй жанчынай. Праўда, высокія пачуцці з усіх бакоў? («Ты выйдзеш за мяне замуж? — А ты мне за гэта што?»)

...А галівудская «зорка» ўсяго толькі і напісала пад здымкам, што заклікае шанаваць сяброў, дзяліцца дабром, будаваць планы на будучыню. Простыя, але вельмі важныя для нашага часу словы. «Калі вы са шчасцем, заходзьце без стуку!»

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Адкрый сваё сэрца!»

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— Якім чынам збіраеце матэрыял для «Павы»?***

— Па вёсках мы не ездзім і песні не запісваем. Бо ёсць ужо шмат сабраных хрэстаматый па фальклоры. Асабліва нам падабаецца зборнік польскага этнографа Міхала Федароўскага. Бяром адтуль мелодыю ці тэкст альбо тое і іншае. Калі гэты матэрыял адгукаецца ўнутры нас, тады прыдумляем, як яго афарміць, як сыграць, што можам дадаць, ад чаго адмовіцца. Вядома, гэтым не абмяжоўваемся. Зараз у сеціве шмат аўтэнтычных беларускіх аудыёзапісаў, якія могуць стаць асновай для нашых будучых апрацовак. Часам падслухоўваем і тое, што знаходзіць Студэнцкае этнаграфічнае таварыства.

***— Як адбываецца сам працэс «перакройкі»?***

— Мы амаль нічога не перарабліваем. Мелодыю пакідаем некранутай, захоўваем тэкст. Адзінае, што бяром, напрыклад, не 10 куплетаў, а два ці тры. Апошнім часам у «Паве» спрабуем больш адыходзіць ад зыходнага матэрыялу. У гурце ёсць два чалавекі — клавішнік, аранжыроўшчык Мікіта Седзянкоў і Валерый Шаўчэнка, прадзюсар і гукарэжысёр, — якія займаюцца электроннай музыкай. Ад іх ідзе асноўная ідэя апрацоўкі, а астатнія дапаўняюць прыдуманы імі музычны каркас.

***— Многія лічаць скрыпку інструментам жалобы...***

— Гэта насамрэч стэрэатып. На ёй жа і музыку для танцаў іграюць, тых жа народных. Яна досыць рознабаковая. А што тычыцца журботнасці, то тут справа не ў інструменце, а ў тым, што для беларусаў у прынцыпе ўласцівая гэта рыса. Я назіраю і заўважаю пэўную меланхолію ў творчасці беларускіх кампазітараў і літаратараў. Вельмі часта ў іх гучыць туга, шкадаванне сябе, сваіх суседзяў.

***— Можаш спяваць і іграць, калі штосьці не па душы?***

— Магу, вядома ж, але гэта адразу адбіваецца на настроі. Я веру, што чалавек мае права не рабіць тое, чаго ён не хоча. Але для гэтага трэба мець смеласць і ўпартасць, праяўляць іх і паступаць так, як ты лічыш патрэбным. Бо толькі ў такім выпадку здзейсненае мае сэнс. Інакш яно нікому не патрэбна.

**«Калі крытыка трапляе да цябе ў душу, гэта сведчыць менавіта аб тым, што ты зрабіў не ўсё, што мог».**

***— На твой погляд, «Пава» карыстаецца папулярнасцю?***

— Так, але толькі ў вузкім беларускамоўным коле. І яно дужа спецыфічнае. Казаць пра тое, што нас ведаюць па ўсёй Беларусі, нельга. Хаця апошнім часам мы сталі часцей з'яўляцца на тэлебачанні і больш ездзіць з выступленнямі па краіне.

***— «Паву» часта крытыкуюць знаўцы музыкі. Як ставішся да гэтага?***

— Балюча. Але, калі крытыка трапляе да цябе ў душу, гэта сведчыць менавіта аб тым, што ты зрабіў не ўсё, што мог.



Гурт «PAWA» ў поўным складзе.

***— Можаш адказаць на пытанне, дзеля чаго працуеце?***

— Цікава было б задаць яго кожнаму ўдзельніку гурта. А я пакуль што дапамагаю сябрам. Пэўна, каб адказаць на гэтае пытанне, трэба самой стварыць уласны праект.

***— А як жа мэта — прывіваць беларусам сваё, роднае?***

— Нашто? Калі гэта добрая рэч — яна прыжывецца, калі дрэнная — памрэ. Вось і правераім *(усміхаецца)*.

***— Злавіла сябе на думцы, што міжвольна праводжу паралель паміж двума гуртамі. Калі «Пава» дапамагае вярнуцца да фальклорных вытокаў, то «Нельга забыць» — да літаратурных.***

— І тут для мяне вяртанне — не мэта. Я люблю граць з хлопцамі з «Нельга забыць», і мне даспадобы, што з гэтага атрымліваецца. Да таго ж мне блізкія тыя ідэі, што мы бяром з літаратурных твораў, асабліва Уладзіміра Караткевіча. У яго атрымліваецца так паказваць беларуса, нібы ён суперчалавек па ўсіх маральных якасцях. Цудоўна, што можна пабачыць сябе ў вобразе яго герояў. Хаця, калі тое, што напісаў Караткевіч, бліжэй да сучасных рэалій, то каб актуалізаваць вершы Максіма Багдановіча, трэба прыкласці крыху больш намаганняў.

Акрамя песень, пакладзеных на вершы беларускіх аўтараў, у нас таксама ёсць шэраг кампазіцый на творы Міхаіла Бараноўскага, нашага лідара і ідэйнага натхняльніка. Пакуль яны не запісаныя ў асобны альбом, таму часам складаецца адчуванне, што мы засяроджаны выключна на перакладанні вершаў на музыку, хаця гэта зусім не так.

***— Ёсць адчуванне, што ты на сваім месцы?***

— Так. Але ў той жа час разумею, што быццам бы не пачала рабіць тое, на што здольная. Магла б больш і лепш.

***— Што перашкаджае?***

— Каб вырас плод, ён павінен саспець. Патрэбны час, каб дарасці да пэўных рэчаў і станаў.

***— Як думаеш, ці маеш свабоду творчасці?***

— Напэўна, не. Гэта, хутчэй, пастаянны складаны працэс барацьбы з несвабодай, які патрэбны, каб адчуць у сабе ўпэўненасць і разуменне таго, чаго я хачу насамрэч. І гэтае абмежаванне ідзе на карысць.

Мы размаўлялі нядаўна з Міхаілам Бараноўскім пра тое, што нельга ствараць штосьці толькі для сябе, што глядач і слухач усё адно існуюць і на іх варта арыентавацца. Але я наіўна веру, што ўсё ж такі можна. Калі музыка ставіць за мэту поспех, славу ды багацце, тады яму цяжка ствараць. Як можна да канца раскрываць сваё сэрца і адначасова думаць, як на гэта адрэагуюць? Калі адкрываеш сэрца, то, тэарэтычна, слава і багацце могуць прыйсці, але неабавязкова. Гэта не павінна быць галоўным.

***— Дзеля чаго тады выступаць?***

— Для мяне мае значэнне сам працэс адчуванняў, пачуццяў, якія ў сабе адкрываеш у момант таго, як спяваеш і граеш. У стасунках паміж людзьмі я бачу тое ж самае раскрыццё душ. Творчасць, глыбіня і ўся сусветная крутасць можа быць і паміж дваімі людзьмі, і паміж выступоўцам і залай. Я лічу сябе чалавекам досыць інтравертным. Але, маркую, музыка — гэта мой сродак размовы з сабою і са слухачом.

**«Веру, што чалавек мае права не рабіць тое, чаго ён не хоча. Але для гэтага трэба мець смеласць і ўпартасць, праяўляць іх і паступаць так, як ты лічыш патрэбным».**

Мне часам дзіўна чуць сябе збоку і здзіўлена ўсведамляць, што прыгожа атрымліваецца, што гэта ўва мне ёсць такія гукі. Я здзіўляюся гэтаму, як і з'явам прыроды. Калі ёсць супадзенне ў тым, як гучыць мой унутраны голас і той, якім я спяваю, тады адбываецца сапраўдны цуд.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 30.11.2016 г.

■ Асоба

**Уладзімір КІРУТА:**

# «Любоў да песні ў мяне з дзяцінства»

**Дырэктар Палаца культуры Мінскага трактарнага завода Уладзімір КІРУТА мае шмат узнагарод — ён лаўрэат прафсаюзнай прэміі «За актыўную работу па развіцці народнага мастацтва і аматарскай творчасці працоўных», узнагароджаны медалём Францыска Скарыны, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, нагрудным знакам Міністэрства культуры «За ўклад у развіццё культуры Беларусі». А яшчэ праводзіць вялікую грамадскую работу. Ён — старшыня савета дырэктараў прафсаюзных і ведамасных устаноў культуры краіны, член праўлення Беларускага саюза музычных дзеячаў. Сёння прапануем чытачам «Звязды» бліжэй пазнаёміцца з гэтым незвычайным чалавекам.**



***— Уладзімір Іванавіч, кажуць, што выбар прафесіі чалавек робіць яшчэ ў школьныя гады. А як было ў вас?***

— Не магу сказаць, што марыў стаць культработнікам з дзяцінства *(смяецца)*. Я родам са Случчыны. Бацькі — простыя сяляне, калгаснікі. У нас шматдзетная сям'я. Акрамя мяне, самага малодшага, яшчэ двое братоў і дзве сястры. Зімовымі вечарамі ўсе мы збіраліся на печы і спявалі песні. Бацькі гэтаму радаваліся, хаця самі не спявалі. Можа, адтуль у мяне любоў да песні, у тым ліку і народнай. Адчуваючы гэту цягу, бацька з пятага класа аддаў мяне ў музычную школу ў Слуцку. Па класе баяна. І я правучыўся там чатыры гады. Пасля паступіў у Мінскае культасветвучылішча.

**«Зімовымі вечарамі ўсе мы збіраліся на печы і спявалі песні. Бацькі гэтаму радаваліся, хаця самі не спявалі. Можа, адтуль у мяне любоў да песні, у тым ліку і народнай».**

Пазней працаваў мастацкім кіраўніком сельскага Дома культуры на Случчыне. Адтуль мяне прызвалі ў армію. Але і ў войску я займаўся сваёй справай: быў удзельнікам ансамбля, іграў на альце ў ваенным духавым аркестры. Дэмабілізаваўшыся, паступіў у Мінскі інстытут культуры. Пасля яго заканчэння кіраваў вакальна-інструментальным ансамблем пры заводзе імя Вавілава. Тут мяне заўважылі, прапанавалі пасаду ў рэспубліканскім міжсаюзным Доме самадзейнай творчасці. Але гэта была работа больш адміністрацыйная, чым творчая. І я трапіў у аматарскі калектыў «Бліскавіца», дзе і правёў шчаслівыя тры гады.

***— І ўсё ж вы не пазбеглі чыноўніцкай, як вы кажаце, пасады. Я маю на ўвазе работу галоўным адміністратарам у Дзяржаўным аркестры сімфанічнай і эстраднай музыкі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга. Як гэта здарылася?***

— Мы з Міхаілам Якаўлевічам знаёмы даўно. Яшчэ студэнтам я падпрацоўваў у цырку ўніфармістам — дапамагаў рыхтаваць арэну. Але і ў цыркавыя нумары мяне часам запрашалі. Я быў вельмі спартыўны юнак, у школе і ў інстытуце ўдзельнічаў ледзь не ва ўсіх спаборніцтвах. А Міхаіл Фінберг у той час кіраваў цыркавым аркестрам. Аднойчы на рэпетыцыі мы пазнаёміліся, і знаёмства доўжыцца ўжо многія гады. Неяк Міхаіл Якаўлевіч запрасіў мяне да сябе і запытаўся, ці не хацеў бы я папрацаваць у яго новым аркестры, які быў ужо шырока вядомы, папулярны ў краіне. Канешне, я з радасцю даў згоду. Ну а з 1998 года я — у Палацы культуры трактарнага завода. Спачатку працаваў намеснікам дырэктара, а з 2003 года — дырэктарам.

***— Прызнаюся шчыра, я даволі кепска ўяўляю, чым займаецца ў наш час ведамасная культасветустанова.***

— Вельмі многім! Дарэчы, некаторыя думаюць, што з распадам Савецкага Саюза распалася і ўся шматгранная работа ў палацах культуры. Але гэта не так. Мы, напрыклад, не толькі нічога не страцілі з таго, што было набыта, але, як кажуць, яшчэ прыдбалі. Стварылі пяць новых творчых калектываў, якія цяпер добра вядомыя ў горадзе і нават у краіне.



Сярод удзельнікаў вакальнага ансамбля «Белы птах».

Гэта — народны вакальны ансамбль «Белы птах», ансамбль народнай песні і цыганскага майстэрства «Ігрыца», узорная студыя эстэтычнага выхавання «Кляксы», шоу-група «Фламенка» і група брэйк-данса. А ўсяго на сённяшні дзень пры Палацы культуры працуе дваццаць пяць творчых калектываў! Своеасаблівай візітоўкай нашага палаца з'яўляецца заслужаны аматарскі калектыў — студыя бальнага танца «Мара». Гэта наш старажыл, яму летась споўнілася пяцьдзясят гадоў. Сённяшнія ўдзельнікі студыі пад кіраўніцтвам заслужанага работніка культуры рэспублікі Лідзіі Кац-Лазаравай годна працягваюць лепшыя традыцыі сваіх папярэднікаў. Вельмі запатрабаваныя народны ансамбль песні і танца «Вязынка», народны драматычны тэатр «На Доўгім бродзе», тэатр гумару і сатыры «Карусель», узорны ансамбль народнага танца «Лянок», народны духавы аркестр, калектыў эстраднай песні і іншыя.

***— І ўсе яны на ўтрыманні Палаца культуры?***

— Нічога падобнага. Яны зарабляюць сродкі і для сябе, і для палаца.

***— Якім жа чынам?***

— У нас ёсць адпаведны сайт, на якім размешчана падрабязная інфармацыя пра кожны калектыў, умовы заказу канцэртаў. І заявак прыходзіць даволі шмат. Зароблены грошы дзеляцца па-брацку: 50 працэнтаў забірае палац, усё астатняе ідзе на патрэбы калектываў.

***— А якія яшчэ клопаты ў дырэктара такой буйной культасветустановы?***

— Вельмі шмат. Іх можна нават згрупаваць па напрамках. Першарадная для мяне задача, зыходзячы з якой я будаваў і будую сваю работу, — гэта развіццё мастацкай творчасці, мастацкіх калектываў. Хачу падкрэсліць, што іх удзельнікі не толькі завадчане, але і ўсе жадаючыя жыхары горада. Канешне, адбор вядзецца на конкурснай аснове з улікам творчых здольнасцяў прэтэндэнтаў. Мая задача заключаецца ў тым, каб гэтым калектывам у нечым дапамагаць, а ў нечым не перашкаджаць *(смяецца)*.

Другі напрамак маіх клопатаў — фестывальная і канцэртная работа. З 2005 года мы праводзім агляд-конкурс аматарскай творчасці сярод работнікаў трактарнага завода пад назваю «Спявай, Беларус!» Менавіта так: з вялікай літары і з клічнікам. Зазначу, што мерапрыемствы конкурсу служаць станоўчым імпульсам для развіцця аматарскай творчасці сярод работнікаў прадпрыемства, разнастаяць і насычаюць асаблівым зместам вольны час трактаразаводцаў. Шмат добрых слоў хочацца сказаць пра дзіцячы харэаграфічны конкурс «Брава, дзеці!», які сёлета прайшоў ужо чацвёрты раз. У ім могуць прымаць удзел аматарскія калектывы незалежна ад ведамаснай прыналежнасці. Каб прадэманстраваць сваё майстэрства, да нас прыязджаюць дзеці з Брэста, Магілёва, Мазыра, Баранавічаў, Віцебска і іншых гарадоў краіны.

Надзвычай кранальна і эмацыянальна праходзіць заўсёды фестываль духавых аркестраў, які стартуе штогод майскімі святочнымі днямі і называецца «Мелодыі Перамогі». Акрамя аркестра нашага палаца,



Адкрыццё міжнароднага фестывалю «Гармонік збірае сяброў».

удзел у фестывалі прымаюць дзясяткі духавых аркестраў горада. Музычны марш-парад пачынаецца каля палаца, рухаецца па бульвары Трактарабудаўнікоў, затым па вуліцы Алега Кашавога і завяршаецца на месцы старту. Асобна трэба сказаць пра конкурс дуэтаў «Песні, якія нас аб'ядноўваюць». Упершыню такі конкурс пад назваю «Зорка + талент = любоў да мастацтва» адбыўся восем гадоў таму. На сцэну палаца разам з самадзейнымі спевакамі завода выйшлі артысты беларускай эстрады Вікторыя Алешка, Андрэй Хлястоў, Юліяна, Стэла, Юля Шыкунец, Анжаліка Макарава... Для нашых завадчан гэта быў неацэнны майстар-клас. А ў 2010 годзе конкурс пашырыў сваю геаграфію і набыў статус міжнароднага. Удзел у ім прынялі ўсе рэгіёны Беларусі, а таксама Расія, Арменія, Украіна, Казахстан, Літва, Польшча, Кітай, Румынія, Латвія, Эстонія. Яшчэ ў больш шырокім фармаце ён прайшоў сёлета, набыўшы сваю пастаянную назву «Песні, якія нас аб'ядноўваюць».

Садзейнічаць духоўнаму ўзбагачэнню і развіццю нацыянальнай культуры заклікаmaking і яшчэ адзін наш міжнародны форум — фестываль калектываў народнай песні «Моц славянскіх сэрцаў». Ідэя фестывалю нарадзілася ў выніку цеснага творчага кантакту Палаца культуры МТЗ і заслужанага калектыву рэспублікі ансамбля народнай музыкі «Бяседа». Узнікла сумесная задума правесці творчую сустрэчу «Бяседа з сябрамі». Яе першымі ўдзельнікамі сталі ансамбль народнай песні «Світанак» Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Партызанскага раёна Мінска, фальклорны тэатр-студыя «Оберіг» з Украіны, музычна-фальклорны ансамбль «Прымакі» з Беластока і ансамбль народнай песні «Славяне» са Смаленска. Такія творчыя сустрэчы сталі традыцыйнымі. Сёлета фестываль прайшоў ужо чацвёрты раз. І зноў ярка і пераканаўча прадэманстраваў сілу славянскага адзінства, якое заключаецца ў высокай духоўнасці, роднасці душ, агульных этнагістарычных каранях.

Што тычыцца міжнародных мерапрыемстваў, то ў нас ёсць яшчэ два цікавыя і папулярныя форумы — фестываль гарманістаў «Гармонік збірае сяброў» і фестываль казачай песні «Гайда».

***— Міжнародныя фестывалі — гэта, безумоўна, выдатна. Але ж вядома, што на іх правядзенне, акрамя вялікіх арганізацыйных намаганняў, патрабуюцца яшчэ і немалыя матэрыяльныя затраты.***

— Так, харчаванне, пражыванне, а таксама сувеніры гасцям, экскурсіі, культурная праграма — усё гэта за наш кошт.

***— І як вы, прабачце, выкручваецеся?***

— Круціцца, канешне, даводзіцца шмат, не без гэтага. Але калі бачыш, што ўсё гэта ў рэшце рэшт дае вялікую духоўную, эстэтычную аддачу, то адчуваеш сябе шчаслівым. Зрэшты мы, работнікі культуры, дзеля таго і працуем, каб несці людзям радасць, узбагачаць іх душы святлом мастацтва, рабіць навакольны свет хоць крыху дабрэйшым.

**Зіновій ПРЫГОДЗІЧ**

■ За падзеяй

# БАГДАНОВІЧА ЧЫТАЛІ Ў ГРОДНЕ

## Вершы класіка гучалі падчас чарговых сустрэч у межах акцыі «Чытаем разам»

**Кажуць, беларусы — народ вельмі паэтычны. Нехта з нашых землякоў спрабаваў пісаць вершы, а нехта — і, думаецца, пераважная большасць з нас — з задавальненнем чытае і перачытвае творы класікаў. Нават калі прафесія і жыццё ў цэлым з паэзіяй зусім не звязаныя. Доказам таму — абласная акцыя «Чытаем разам», якая сёлета, у Год культуры, арганізавана ва ўсіх публічных бібліятэках Гродзенскай вобласці. Ініцыятарамі праекта выступілі галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама і Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Яўхіма Карскага.**

— На працягу года прадстаўнікі ўлады, знакамітыя людзі нашага рэгіёна, студэнты, школьнікі і ўвогуле аматары літаратуры чыталі творы Кандрата Крапівы і Элізы Ажэшкі, Янкі Купалы і Якуба Коласа, урыўкі з твораў пра Вялікую Айчынную вайну, — расказвае **дырэктар Гродзенскай абласной бібліятэкі імя Я. Карскага Лідзія МАЛЬЦАВА.** — Адметна, што запрашэнні прыняць удзел у мерапрыемствах з задавальненнем прымалі начальнікі (і намеснікі начальнікаў) галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі і ўпраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама, галоўны пракурор Гродзенскай вобласці, галоўны рэдактар газеты «Гродзенская праўда», дырэктар тэлерадыёкампаніі «Гродна», кіруючыя асобы Узброеных Сіл, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, старшыні і намеснікі старшынь райвыканкамаў і сельскіх саветаў, кіраўнікі прадпрыемстваў і ўстаноў вобласці.

Пятая сустрэча ў межах абласной акцыі, што адбылася ўчора, была прысвечана Максіму Багдановічу, чыё 125-годдзе мы адзначаем сёлета. Сімвалічна, што памяць паэта ўшанавалі жыхары горада, дзе творца пражыў некалькі гадоў свайго дзяцінства.

— Ідэю гэтай акцыі мы некалі «падгледзелі» ў Польшчы, падумалася, што і на Гродзеншчыне можна зладзіць чытанні твораў нашых класікаў з удзелам знакамітых людзей рэгіёна, прадстаўнікоў улады, — кажа **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама Аляксандр ВЯРСОЦКІ.** — Ды і вершы класікаў многім помняцца са школьных гадоў, іх нават вучыць на памяць не трэба — проста паўтарыць, успомніць. Я з задавальненнем прымаю ўдзел у чытаннях і заўсёды выбіраю свае любімыя творы, тыя, што найбольш уразілі калісьці і добра помняцца сёння.

Вось і ўчора ганаровымі гасцямі імпрэзаў, прысвечаных творчасці Максіма Багдановіча, былі начальнік інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Гродзенскай вобласці Лідзія Сямашка, старшыня Гродзенскай абласной арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў дзяржаўных і іншых устаноў Алена Бераснева. Вершы Багдановіча на беларускай, рускай, англійскай, нямецкай і французскай мовах чыталі таксама студэнты, кадэты, школьнікі і ўсе жадаючыя далучыцца да гэтай прыгожай акцыі.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

# Прайшоў першы пленум новага склікання

**Следам за чарговым з'ездам Саюза пісьменнікаў Беларусі, які праходзіў днямі, праведзены першы пленум праўлення грамадскага аб'яднання.**

Абраны прэзідыум праўлення, куды ўвайшлі 45 літаратараў краіны. Старшыня СПБ Мікалай Іванавіч Чаргінец, падсумоўваючы вынікі дзейнасці арганізацыі, адзначыў работу першага сакратара аб'яднання Генадзя Пашкова і сакратара Георгія Марчука.

На пленуме абраны новыя кіраўнікі СПБ. Намеснікамі старшыні сталі празаік і публіцыст Анатоль Крэйдзіч, які дагэтуль займаў пасаду старшыні Брэсцкага абласнога аддзялення СПБ, і публіцыст, дзіцячы пісьменнік Алена Стэльмах (галоўны рэдактар часопіса «Родная прырода»).

**Сяргей ШЫЧКО.**

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | **Лот №1. Рассеиватель минеральных удобрений дисковый РДУ-3,0 в количестве трех единиц, новый, начальная стоимость лота – 27 807,02 белорусского рубля** |
| Собственник (владелец) имущества | Открытое акционерное общество «Технолит Полоцк» |
| Местонахождение имущества | г. Полоцк, ул. Ленинградская, 101.<br>По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к Табачниковой Светлане Александровне, тел. 8 (029) 712-75-13 |
| Наличие обременений | Залог ОАО «БПС-Сбербанк» |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.4<br>19 декабря 2016 года в 10.00 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210029, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1<br>Судебный исполнитель Атрахимович Николай Александрович, тел. (0212) 61 40 24<br>Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 61 40 15 |

| | |
|---|---|
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 филиала № 200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 **не позднее 15.00 16 декабря 2016 года.**<br>Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота.<br>В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

## ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ООО «ДАТЧ СТАР»,

**опубликованные в газете «Звязда» 6.09.2016 г. №171**

**«Многоквартирный жилой дом с подземной гараж-стоянкой (№1 по генплану в квартале пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского) со встроенно-пристроенными объектами обслуживания населения» I очередь строительства, 6-11 секции, II очередь строительства, секции 1-3» 3-4 пусковой комплекс:**

«Стоимость 1 кв.м жилого помещения для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, на момент опубликования изменений в проектной декларации по договорам создания объекта долевого строительства составляет: 4 однокомнатные квартиры площадью от **38,48** до **38,75** кв.м, составляющей долларовый эквивалент от **1050** до **1320** долларов США, **6** трехкомнатных квартир площадью от **83,22** до **83.60** кв.м, составляющей долларовый эквивалент от **900** до **1200** долларов США. На предприятии действует система регулирования стоимости, зависимая от площади, этажа и условий оплаты строящегося жилого помещения».

**Дополнительную информацию можно получить по адресу:**
**г. Минск, ул. 3-я Щорса, 9, офис 505.**
**Тел.: +375 44 53 43 000, +375 29 53 43 000**

УНП 191061436

Утерянный полис страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» Карта международного моторного страхования (страховой сертификат «Зеленая карта») серии BY 07 номер 12318198 **считать недействительным.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ КОНКУРСА

### Гомельский областной исполнительный комитет (организатор конкурса) извещает о проведении конкурса по выбору заказчика (застройщика) по строительству объекта «Многоквартирный 10-этажный жилой дом по ул. Жукова (в районе жилого дома № 2) в городе Гомеле» (далее – конкурс)

**Предмет конкурса:** право выступать заказчиком (застройщиком) по строительству объекта «Многоквартирный 10-этажный жилой дом по ул. Жукова (в районе жилого дома № 2) в городе Гомеле»

**Наименование объекта строительства:** «Многоквартирный 10-этажный жилой дом по ул. Жукова (в районе жилого дома № 2) в городе Гомеле».
Земельный участок для строительства многоквартирного жилого дома располагается в квартале многоквартирной жилой застройки в Советском административном районе города Гомеля.
Согласно генеральному плану города Гомеля (корректировка) (объект 53.14), данный участок находится в зоне перспективного строительства многоквартирной застройки и соответствует его функциональному зонированию.
Архитектурно-планировочная концепция размещения многоэтажного жилого дома по ул. Жукова принята с учетом проведенного общественного обсуждения, организованного в установленном законодательством порядке администрацией Советского района города Гомель с 11 июля по 4 августа 2016 г.
Участок строительства свободен от застройки, расположен в районе жилого дома № 2.
Размещение объекта регламентируется «красной линией» ул. Жукова и санитарными нормами согласно техническим нормативным правовым актам.
Площадь земельного участка для строительства и обслуживания многоквартирного жилого дома ориентировочно 0,57 га. Этажность – не менее 10 этажей.
Разработать индивидуальный проект дома с использованием индустриальных методов строительства и современных отделочных материалов с высокими эстетическими и эксплуатационными характеристиками.
Инженерно-техническое обеспечение объекта с указанием точек подключения к городским сетям выполнить согласно техническим условиям заинтересованных организаций, с учетом технического обоснования по каждому необходимому ресурсу

**Место проведения конкурса:** 246000, Республика Беларусь, г. Гомель, пр. Ленина, 2, Гомельский областной исполнительный комитет, тел. 8(0232)754622

**Порядок проведения конкурса:** определен Положением о порядке организации и проведения конкурсов по выбору заказчика (застройщика) по строительству многоквартирных жилых домов, за исключением жилых домов повышенной комфортности, в г. Минске и областных центрах (далее – Положение), утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 10 сентября 2013 г. № 798 (Национальный правовой интернет-портал Республики Беларусь, 19.09.2013, 5/37805).
**Конкурс проходит в два этапа.**
**Первый этап – предварительный квалификационный отбор.**
**Второй этап – конкурс по выбору заказчика (застройщика) по строительству объекта**

**Дата, время и место приема заявления на участие в конкурсе и прилагаемых к нему документов. Срок подачи заявлений на участие в предварительном квалификационном отборе:** рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 16.00. Последний день приема заявлений на участие в конкурсе – **27 января 2017 г. до 16.00. Заявление и документы для предварительного классификационного отбора представляются** секретарю конкурсной комиссии по адресу: 246000, Республика Беларусь, г. Гомель, пр-т Ленина, 2, каб. 404, тел. (80232) 754622 в запечатанном конверте с надписью «Предварительный квалификационный отбор для участия в конкурсе по выбору заказчика (застройщика) по строительству объекта «Многоквартирный 10-этажный жилой дом по ул. Жукова (в районе жилого дома № 2) в городе Гомеле». «Не вскрывать!». На конверте указывается наименование претендента.
«Образец заявления» размещен на сайте www.gomel-region.gov.by, раздел «Строительство и архитектура». Претендент представляет следующие документы на русском языке, подтверждающие экономическое и финансовое положение претендента:
**1.** копия (без нотариального засвидетельствования) устава, имеющего штамп, свидетельствующий о проведении государственной регистрации;
**2.** бухгалтерская отчетность за последний отчетный год и период;
**3.** справка о коэффициентах платежеспособности претендента (коэффициент текущей ликвидности, коэффициент обеспеченности собственными оборотными средствами, коэффициент обеспеченности финансовых обязательств активами и другое), рассчитанных в установленном законодательством порядке;
**4.** расчеты прибыли за последние три года;
**5.** расчет стоимости чистых активов претендента на первое число месяца, предшествующего месяцу подачи заявления на участие в конкурсе;
**6.** сведения о дебиторской и кредиторской задолженностях, в том числе просроченных свыше трех месяцев, на первое число месяца, предшествующего месяцу подачи заявления на участие в конкурсе;
**7.** справка о задолженности по платежам в бюджет на 1 число месяца подачи заявления на участие в конкурсе;
**8.** справка об аудиторской проверке деятельности организации-претендента;
**9.** справка о платежеспособности из банка, в котором обслуживается претендент;
**10.** документы, содержащие сведения о возведении многоквартирных жилых домов за последние три года и сроках ввода их в эксплуатацию, заказчиком (застройщиком) по которым является претендент.
**Кроме этого, претендентом представляются подтвержденные документально сведения:**
- о деловой репутации претендента (не менее 3 отзывов);
- о наличии опыта работ по строительству многоквартирных жилых домов за последние три года;
- о выполнении аналогичных проектов, сопоставимых по виду и объему с объектом строительства (реализованных, нереализованных);
- об участии претендента в качестве ответчика в судебных или арбитражных процессах с указанием предмета иска за последние три года;
- о наличии наложенного ареста на имущество претендента.
Предоставление задатка на участие в конкурсе на этапе предварительного квалификационного отбора не требуется.
*Предложения, представленные позже указанного срока, к рассмотрению не принимаются. Конкурсная комиссия имеет право продлить срок подачи заявлений*

| | |
|---|---|
| Дата, время и место вскрытия конвертов претендентов предварительного квалификационного отбора | **1 февраля 2017 г. 10.00. Гомельский областной исполнительный комитет, г. Гомель, пр. Ленина, 2 (1-й этаж, зал заседаний)** |
| Дата, время и место проведения предварительного квалификационного отбора | **8 февраля 2017 г. 10.00. Гомельский областной исполнительный комитет, г. Гомель, пр. Ленина, 2 (1-й этаж, зал заседаний)** |

**К участию в конкурсе по выбору заказчика (застройщика) по строительству объекта допускаются претенденты, прошедшие предварительный квалификационный отбор, внесшие в установленном порядке задаток, своевременно подавшие конкурсное предложение и прилагаемые к нему документы**

**Подробности о предмете конкурса, состав конкурсного предложения, перечень прилагаемых к нему документов отражены в конкурсной документации**. Конкурсная документация представляется секретарем комиссии претендентам, прошедшим предварительный квалификационный отбор, не позднее трех рабочих дней после перечисления задатка и подачи заявления на участие в конкурсе по адресу: 246000, Республика Беларусь, г. Гомель, проспект Ленина, 2, каб. 404, тел. 754622.
Задаток **в сумме 2000 бел. руб. перечисляется на р/с 3015056440074 в филиале 300 ГОУ «АСБ Беларусбанк», получатель – ГУ «Гомельоблстройкомплекс», адрес банка: 246050, г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а, получатель: государственное учреждение «Гомельское областное управление строительным комплексом», адрес: 246050, г. Гомель, ул. Советская, 28. УНП 490321784, т./ф.: 740394, 748831.** Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в конкурсе (2-й этап)

**Дата, время и место приема конкурсного предложения и прилагаемых к нему документов:** рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 16.00. Последний день приема заявлений на участие в конкурсе – **21 февраля 2017 г. до 13.00. Заявление и конкурсные предложения представляются** секретарю конкурсной комиссии по адресу: 246000, Республика Беларусь, г. Гомель, пр-т Ленина, 2, каб. 404, тел. (80232) 754622 в запечатанном конверте с надписью «Конкурсное предложение для участия в конкурсе по выбору заказчика (застройщика) по строительству объекта «Многоквартирный 10-этажный жилой дом по ул. Жукова (в районе жилого дома № 2) в городе Гомеле». «Не вскрывать!». На конверте указывается наименование претендента.
Претендент имеет право отозвать свое конкурсное предложение до окончания срока подачи конкурсных предложений

**Срок, в течение которого организатор конкурса может реализовать свое право на отказ от проведения конкурса:** в любое время, но не позднее 5 (пяти) календарных дней до даты проведения заседания конкурсной комиссии по определению результатов предварительного квалификационного отбора претендентов

**Дата, время и место заседания конкурсной комиссии по вскрытию конвертов с конкурсными предложениями с участием представителей претендентов: 22 февраля 2017 г. 10.00. Гомельский областной исполнительный комитет, г. Гомель, пр. Ленина, 2 (1-й этаж, зал заседаний)**

**Дата, время и место выбора победителя конкурса по выбору заказчика (застройщика) по строительству объекта: 9 марта 2017 г. 10.00. Гомельский областной исполнительный комитет, г. Гомель, пр. Ленина, 2 (1-й этаж, зал заседаний).**
**Претенденту, не победившему в конкурсе, задаток возвращается** в течение 5 (пяти) рабочих дней после подведения итогов по выбору победителя

**Срок подписания договора на реализацию права строительства объекта, заключаемого по результатам конкурса: не позднее 20 дней со дня утверждения протокола о выборе победителя конкурса.** Существенные условия последующей сделки оговариваются в планируемом к заключению договоре на реализацию права строительства объекта

**Возмещение затрат на организацию и проведение конкурса** (расходы по публикации извещений в средствах массовой информации, затрат на подготовку конкурсной документации и ее тиражирование, почтовые, канцелярские и другие расходы, предусмотренные законодательством) **осуществляется победителем конкурса** в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента подведения результатов конкурса и до подписания договора на реализацию права на строительство объекта. Организатору конкурса представляются заверенные надлежащим образом копии платежных документов, подтверждающих возмещение расходов на организацию и проведение конкурса

**Информация о проведении конкурса, в том числе перечень документов для предварительного квалификационного отбора, а также формы документов**, предоставляемых претендентами конкурса, размещена на официальном интернет-портале Гомельского облисполкома **http://gomel-region.gov.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ КОНКУРСА

### Гомельский областной исполнительный комитет (организатор конкурса) извещает о проведении конкурса по выбору заказчика (застройщика) по строительству объекта «Многоквартирный жилой дом на пересечении улиц Сенная–Педченко в городе Гомеле» (далее – конкурс)

**Предмет конкурса:** право выступать заказчиком (застройщиком) по строительству объекта «Многоквартирный жилой дом на пересечении улиц Сенная–Педченко в городе Гомеле»

**Наименование объекта строительства:** «Многоквартирный жилой дом на пересечении улиц Сенная–Педченко в городе Гомеле».
Земельный участок для строительства многоквартирного жилого дома располагается в квартале усадебной застройки в Центральном административном районе города Гомеля на пересечении улиц Сенная–Педченко.
Согласно генеральному плану города Гомеля (корректировка) (объект 53.14), данный участок находится в зоне перспективного строительства многоквартирной застройки и соответствует функциональному зонированию.
На предлагаемом земельном участке для строительства многоквартирного жилого дома имеется усадебная застройка: жилые дома и строения неустановленного назначения. Все строения и сооружения в границах предлагаемого участка подлежат сносу. Изъятие и предоставление земельных участков выполняется в установленном законодательством порядке.
Площадь земельного участка для строительства и обслуживания многоквартирного жилого дома ориентировочно 0,40 га. Этажность – не менее 9 этажей.
Разработать индивидуальный проект дома с использованием индустриальных методов строительства и современных отделочных материалов с высокими эстетическими и эксплуатационными характеристиками.
Инженерно-техническое обеспечение объекта с указанием точек подключения к городским сетям выполнить согласно техническим условиям заинтересованных организаций, с учетом технического обоснования по каждому необходимому ресурсу.
Размещение объекта на данном участке регламентируется «красной линией» жилых улиц, охранными зонами инженерных сетей и сооружений, санитарными нормами согласно техническим нормативным правовым актам (далее – ТНПА)

**Место проведения конкурса:** 246000, Республика Беларусь, г. Гомель, пр. Ленина, 2, Гомельский областной исполнительный комитет, тел. 8(0232)754622

**Порядок проведения конкурса:** определен Положением о порядке организации и проведения конкурсов по выбору заказчика (застройщика) по строительству многоквартирных жилых домов, за исключением жилых домов повышенной комфортности, в г. Минске и областных центрах (далее – Положение), утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 10 сентября 2013 г. № 798 (Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 19.09.2013, 5/37805).
**Конкурс проходит в два этапа.**
**Первый этап – предварительный квалификационный отбор.**
**Второй этап – конкурс по выбору заказчика (застройщика) по строительству объекта**

**Дата, время и место приема заявления на участие в конкурсе и прилагаемых к нему документов. Срок подачи заявлений на участие в предварительном квалификационном отборе:** рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 16.00. Последний день приема заявлений на участие в конкурсе – **27 января 2017 г. до 16.00. Заявление и документы для предварительного классификационного отбора представляются** секретарю конкурсной комиссии по адресу: 246000, Республика Беларусь, г. Гомель, пр-т Ленина, 2, каб. 404, тел. (80232) 754622 в запечатанном конверте с надписью «Предварительный квалификационный отбор для участия в конкурсе по выбору заказчика (застройщика) по строительству объекта «Многоквартирный жилой дом на пересечении улиц Сенная–Педченко в городе Гомеле». «Не вскрывать!». На конверте указывается наименование претендента.
«Образец заявления» размещен на сайте www.gomel-region.gov.by, раздел «Строительство и архитектура». Претендент представляет следующие документы на русском языке, подтверждающие экономическое и финансовое положение претендента:
**1.** копия (без нотариального засвидетельствования) устава, имеющего штамп, свидетельствующий о проведении государственной регистрации;
**2.** бухгалтерская отчетность за последний отчетный год и период;
**3.** справка о коэффициентах платежеспособности претендента (коэффициент текущей ликвидности, коэффициент обеспеченности собственными оборотными средствами, коэффициент обеспеченности финансовых обязательств активами и другое), рассчитанных в установленном законодательством порядке;
**4.** расчеты прибыли за последние три года;
**5.** расчет стоимости чистых активов претендента на первое число месяца, предшествующего месяцу подачи заявления на участие в конкурсе;
**6.** сведения о дебиторской и кредиторской задолженностях, в том числе просроченных свыше трех месяцев, на первое число месяца, предшествующего месяцу подачи заявления на участие в конкурсе;
**7.** справка о задолженности по платежам в бюджет на 1 число месяца подачи заявления на участие в конкурсе;
**8.** справка об аудиторской проверке деятельности организации-претендента;
**9.** справка о платежеспособности из банка, в котором обслуживается претендент;
**10.** документы, содержащие сведения о возведении многоквартирных жилых домов за последние три года и сроках ввода их в эксплуатацию, заказчиком (застройщиком) по которым является претендент.
**Кроме этого претендентом представляются подтвержденные документально сведения:**
- о деловой репутации претендента (не менее 3-х отзывов);
- о наличии опыта работ по строительству многоквартирных жилых домов за последние три года;
- о выполнении аналогичных проектов, сопоставимых по виду и объему с объектом строительства (реализованных, нереализованных);
- об участии претендента в качестве ответчика в судебных или арбитражных процессах с указанием предмета иска за последние три года;
- о наличии наложенного ареста на имущество претендента.
Предоставление задатка на участие в конкурсе на этапе предварительного квалификационного отбора не требуется.
*Предложения, представленные позже указанного срока, к рассмотрению не принимаются. Конкурсная комиссия имеет право продлить срок подачи заявлений*

| | |
|---|---|
